# МОЛАДЗЬ БЕЛАРУСІ Ў БАЯХ ЗА РАДЗІМУ

91172-8
475



ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б) Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

# Моладзь Беларусі ў баях за Радзіму

89.1(2-2-8)
М75
18800



ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б
«СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»
1943

Инв.
1954 г.



Пятро **ГЛЕБКА**

# ПРАВАДЫР

Цяжкая, суровая доля нам выпала...
Мы цвёрда сустрэлі каварны удар!
Успыхнула ненавісць полымем вымпела —
І грознага гневу разліўся пажар.

У гэтым агні наша вытрымка кована,
Каторай нікому нічым не зламаць,
У гэтым агні наша мужнасць гартована,
Якая на подвігі рушыла рать.

І мы пад цяжарам бяды не сагнуліся, —
На ўсю неабдымную веліч і шыр
Народныя сілы ў баях развінуліся,
Бо з намі, у сэрцах у нас — правадыр.

Нікім не заўважаны, — полем, гасцінцамі
Вядзе ён на ворага нашы палкі,
Нябачна ў зямлянках жыве з пехацінцамі
І водзіць гвардзейскія часці ў штыкі.

Калі-ж пранізаныя лютаю куляю
Мы падаем ніц у няроўным баю,
Ён ціха падходзіць і з ласкаю чулаю
На помач руку падае нам сваю.

І мы падымаемся хвалямі ярымі,
Кідаемся ў бітвы раз'юшаны вір,
І коціцца вораг пад нашымі ўдарамі,
Бо з намі, у сэрцах у нас — правадыр.

Ідзе ён знаёмай паходкаю простаю,
І рунь зелянее на чорных палях,
І скрозь — над Калінінам, Клінам і Роставам
Гарыць і трапечацца сонечны сцяг.

Ён бурай ваеннай, агнямі апалены,
На ім палымнее нязмытая кроў.
Пад сцягам пурпуравым Леніна—Сталіна
Мы прыдзем да мірнага шчасця ізноў.

Мы духам — нязломныя, воляй — упартыя,
Бо ведае кожны баец, камандзір,
Што з намі вялікая мудрая партыя,
Што з намі, наперадзе — наш правадыр.

★

## ПРЫСЯГА БЕЛАРУСКІХ ПАРТЫЗАН

Я, грамадзянін Вялікага Совецкага Саюза, верны сын тераічнага беларускага народа, клянуся, што не выпушчу з рук зброі, пакуль апошні фашысцкі гад на нашай беларускай зямлі не будзе знішчаны.

Я абавязваюся няўхільна выконваць загады сваіх камандзіраў і начальнікаў, строга трымацца воінскай дысцыпліны. За спаленыя гарады і вёскі, за смерць нашых дзяцей, за катаванні, гвалты і здзекі над маім народам я клянуся помсціць ворагу жорстка, бязлітасна і няспынна.

Кроў за кроў, смерць за смерць!

Я клянуся ўсімі сродкамі дапамагаць Чырвонай Арміі знішчаць шалёных гітлераўскіх сабак, не шкадуючы крыві і свайго жыцця. Я клянуся, што хутчэй загіну ў жорсткім баю з ворагам, чым аддам сябе, сваю сям'ю і ўвесь беларускі народ у рабства крываваму фашызму.

Калі-ж па маёй слабасці, баязлівасці або злой волі я парушу гэтую сваю прысягу і здраджу інтарэсам народа, няхай памру ганебнай смерцю ад рукі сваіх таварышаў.

(Прысяга была складзена і ўпершыню прынята гомельскімі партызанамі ў ліпені 1941 года).

★

Якуб КОЛАС

## БАЙЦАМ-КОМСАМОЛЬЦАМ

Арлы маладыя,
Я вас пазнаю
Бясстрашных і мужных
У грозным баю.

Пад вашым напорам
Хістаецца даль,
Пад вашым ударам
Згінаецца сталь.

І крышацца танкі
Фашысцкія ў соль,
І падае вораг,
Як горкі куколь.

Пілот — комсамолец,
Танкіст і стралок —
Нястрымная слава,
Вясенні паток,

Што орды тэўтонаў,
Нямецкіх сабак
Развее, рассее,
Раскрышыць на мак.

На сушы, на моры,
У высі нябёс
Ваш дух непахісны
Сцяг славы узнёс.

Паднят ён высока,
Як зоры Крэмля,
І вас услаўляе
Радзіма — зямля.

Арлы маладыя,
Юначая кроў,
І радасць вы наша,
І наша любоў!

★



М. В. ЗІМЯНІН

Сакратар ЦҚ ЛҚСМ Беларусі

## МОЛАДЗЬ У БАЯХ ЗА БЕЛАРУСЬ

Больш 2 год вядзе совецкі народ вялікую Айчынную вайну супроць гітлераўскіх захопнікаў, якія вераломна напалі на Совецкую краіну, акупіравалі Беларусь.

Варварскае разбурэнне народнай гаспадаркі, драпежнае знішчэнне і разграбленне матэрыяльных, культурных каштоўнасцей краіны, страшэнная расправа над нашым народам — шыбеніцы, расстрэлы, спальванне ў агні, катаванне ў засценках гестапа і канцлагерах, гвалтаванне, здзекі над нацыянальнай і наогул чалавечаю годнасцю совецкіх людзей — вось што прынеслі на сваіх штыках нямецкія бандыты беларускаму народу і яго моладзі.

Дзе ступіў немец-людаед, — прыйшла сама смерць. Звыш 700 тысяч совецкіх людзей знішчылі праклятыя акупанты на Беларусі. 80 тысяч бязвінных людзей пабілі немцы ў раёне Мінска, 15 тысяч у Віцебску, 14 тысяч у Магі-

леве, 10 тысяч у Пінску, 8 тысяч у Шклове, звыш 5 тысяч у Бабруйску. Тых, што засталіся ў жывых, чакаюць катаванні і галодная смерць.

Вораг паліць беларускія вёскі. Гараць у агні не толькі забітыя немцам, але і жывыя, асуджаныя ім на страшэнную смерць—нашы маткі і сёстры, старыя і дзеці.

Немцы спустошылі Суражскі раён на Віцебшчыне. За 4 дні яны спалілі ў раёне 2.221 хату, расстралялі і павесілі 124 калгаснікаў.

Зімой 1942-43 гадоў карныя экспедыцыі немцаў абрушыліся на сотні вёсак Мінскай, Магілеўскай, Палескай, Пінскай абласцей. Не дабіўшыся ваенных поспехаў у баях супроць партызан, нямецкія каты знішчылі тысячы мірных совецкіх людзей. У Асіпавіцкім і Чэрвенскім раёнах толькі за 7 дзён было забіта 1.885 сялян, у Старобінскім і Любаньскім раёнах — 2.386, у Ленінскім і Ганцэвіцкім—звыш 3.000, у Жыткавіцкім—480 расстраляна, 4.805 спалена, 579 вывезена на катаргу ў Германію.

Супроць нямецкіх людаедаў і катаў паднімаюцца ўсе нашы людзі, уся наша зямля. Мы прайшлі за два гады велізарную школу такой ненавісці да ворага, якая спапяліць яго. Усе імкненні нашай душы, уся мэта нашага жыцця ўвасабляецца цяпер у адным—смерць немцу—гаду!

У імя гэтай пачэснай мэты змагаюцца разам з усім совецкім народам беларусы на франтах Айчыннай вайны і ў тыле нямецкіх акупантаў, праяўляючы ўсюды ў баях беззаветны гераізм і мужнасць.

У імя гэтай мэты змагаецца і моладзь Беларусі.

Усенароднай славай увенчаны імёны яе лепшых прадстаўнікоў — выхаванцаў Ленінска-Сталінскага Комсамола лётчыкаў Гастэла і Каў-

шарава, снайпера Смалячкова, партызан Сільніцкага і Курыленка, якіх Совецкі ўрад узнагародзіў званнем Герояў Совецкага Саюза.

Велізарнага размаху дасягнула партызанская вайна беларускага народа.

Моладзь Беларусі вартая свайго народа. Многія дзесяткі тысяч комсамольцаў і моладзі Беларусі ваююць у радах партызан за вызваленне Радзімы ад нямецка-фашысцкага прыгнёту. У баях з нямецкімі акупантамі маладыя беларусы праяўляюць лепшыя якасці, выхаваныя ў совецкай моладзі партыяй Леніна-Сталіна: бязмежную адданасць Радзіме, храбрасць, баявую кемлівасць і дзёрзкасць, невычарпальную энергію, якія так ярка характарызуюць наша маладое пакаленне.

Штодня праяўляецца масавы гераізм моладзі ў цяжкіх выпрабаваннях партызанскай вайны. Выраслі тысячы выдатных маладых разведчыкаў, дыверсантаў, радыстаў, кулямётчыкаў, стралкоў, байцоў усіх родаў зброі.

У радзе абласцей Беларусі ваююць комсамольска-маладзёжныя атрады і групы. Такія з іх, як атрад імя Ленінскага Комсамола, атрад імя Леніна, імя КІМ, імя Гастэла і другія маюць на сваім рахунку дзесяткі падарваных нямецкіх эшалонаў і ваенных аб'ектаў ворага, тысячы знішчаных нямецкіх вылюдкаў.

Узнімаюцца новыя імёны выдатных маладых партызан—славы народа. Сярод соцень варожых эшалонаў, пушчаных пад адкос беларускімі партызанамі—23 падарваны Паўлюком К. — комсамольцам, магілеўскім партызанам, 16—Аркадзіем Г. і яго маладымі таварышамі — паляшукамі,

27—слаўнымі маладымі партызанамі на чале з комсамольцам Ч., 17—маладзёжнай групай Максіма, 16—групай комсамольца Ф.—на Віцебшчыне, 5—комсамолкай Фрузай Ф.—на Магілеўшчыне. А кожны пушчаны пад адкос варожы эшалон—гэта благародная рызыка жыццём у імя Радзімы, рызыка, якая прыносіць выйгрыш бою!

Пайшла ўжо ў народзе неўміручая слава пра 13 комсамольцаў — партызан Магілеўшчыны, прыняўшых на сябе ўдар варожага батальёну і загінуўшых у няроўным баю. Але дорага заплацілі немцы за смерць комсамольцаў, на кожнага маладога патрыёта прыходзілася па 10 забітых фашыстаў.

Ужо спявае на Случчыне народ песню аб 17 маладых героях Лаўскага бою, якія біліся да апошняга патрона ў засадзе і калі былі акружаны,—штыхамі біліся да апошняй кроплі крыві. Звыш 100 немцаў палягло каля тых могілак, дзе іх сустрэла партызанская засада ворага.

У кожным партызанскім атрадзе Беларусі ёсць свае любімцы — юнакі і дзяўчаты, ініцыятары адважных баявых спраў моладзі і запявалы партызанскіх песень. Лік іх расце кожны дзень.

Комсамольскія арганізацыі пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі ва ўсіх кутках Радзімы вядуць арганізуючую і выхаваўчую работу сярод моладзі.

Ніякі тэрор ворага не спыніць гэтай работы. Выдатнейшыя комсамольскія арганізатары, як Аляксандр Ісачэнка, Іван Чуклай, Рыма Шаршнёва, аддалі сваё жыццё ў вайне за свабоду, чэсць і незалежнасць Радзімы, а подвігі іх узнімаюць на бой тысячы новых маладых арганізатараў моладзі. Хутка прыдзе час-і мы наза-

шарава, снайпера Смалячкова, партызан Сільніцкага і Курыленка, якіх Савецкі ўрад узнагародзіў званнем Герояў Савецкага Саюза.

Велізарнага размаху дасягнула партызанская вайна беларускага народа.

Моладзь Беларусі вартая свайго народа. Многія дзесяткі тысяч камсамольцаў і моладзі Беларусі ваююць у радах партызан за вызваленне Радзімы ад нямецка-фашысцкага прыгнёту. У баях з нямецкімі акупантамі маладыя беларусы праяўляюць лепшыя якасці, выхаваныя ў савецкай моладзі партыяй Леніна-Сталіна: бязмежную адданасць Радзіме, храбрасць, баявую кемлівасць і дзёрзкасць, невычарпальную энергію, якія так ярка характарызуюць наша маладое пакаленне.

Штодня праяўляецца масавы гераізм моладзі ў цяжкіх выпрабаваннях партызанскай вайны. Выраслі тысячы выдатных маладых разведчыкаў, дыверсантаў, радыстаў, кулямётчыкаў, стралкоў, байцоў усіх родаў зброі.

У радзе абласцей Беларусі ваююць камсамольска-маладзёжныя атрады і групы. Такія з іх, як атрад імя Ленінскага Камсамола, атрад імя Леніна, імя КІМ, імя Гастэла і другія маюць на сваім рахунку дзесяткі падарваных нямецкіх эшалонаў і ваенных аб'ектаў ворага, тысячы знішчаных нямецкіх вылюдкаў.

Узнімаюцца новыя імёны выдатных маладых партызан—славы народа. Сярод соцень варожых эшалонаў, пушчаных пад адкос беларускімі партызанамі—23 падарваны Паўлюком К. — камсамольцам, магілеўскім партызанам, 16—Аркадзіем Г. і яго маладымі таварышамі — паляшукамі,

27—слаўнымі маладымі партызанамі на чале з комсамольцам Ч., 17—маладзёжнай групай Максіма, 16—групай комсамольца Ф.—на Віцебшчыне, 5—комсамолкай Фрузай Ф.—на Магілеўшчыне. А кожны пушчаны пад адкос варожы эшалон—гэта благародная рызыка жыццём у імя Радзімы, рызыка, якая прыносіць выйгрыш бою!

Пайшла ўжо ў народзе неўміручая слава пра 13 комсамольцаў — партызан Магілеўшчыны, прыняўшых на сябе ўдар варожага батальёну і загінуўшых у няроўным баю. Але дорага заплацілі немцы за смерць комсамольцаў, на кожнага маладога патрыёта прыходзілася па 10 забітых фашыстаў.

Ужо спявае на Случчыне народ песню аб 17 маладых героях Лаўскага бою, якія біліся да апошняга патрона ў засадзе і калі былі акружаны,—штыхамі біліся да апошняй кроплі крыві. Звыш 100 немцаў палягло каля тых могілак, дзе іх сустрэла партызанская засада ворага.

У кожным партызанскім атрадзе Беларусі ёсць свае любімцы — юнакі і дзяўчаты, ініцыятары адважных баявых спраў моладзі і запявалы партызанскіх песень. Лік іх расце кожны дзень.

Комсамольскія арганізацыі пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі ва ўсіх кутках Радзімы вядуць арганізуючую і выхаваўчую работу сярод моладзі.

Ніякі тэрор ворага не спыніць гэтай работы. Выдатнейшыя комсамольскія арганізатары, як Аляксандр Ісачэнка, Іван Чуклай, Рыма Шаршнёва, аддалі сваё жыццё ў вайне за свабоду, чэсць і незалежнасць Радзімы, а подвігі іх узнімаюць на бой тысячы новых маладых арганізатараў моладзі. Хутка прыдзе час-і мы наза-

вём многа імён тых, хто будучы партызанам або падпольшчыкам аддаваў свае сілы і жыццё многагранцай баявой, палітычнай рабоце ў масах моладзі і набліжаў час перамогі.

Цяпер, як ніколі, вялікія, пачэсныя і адказныя задачы комсамола і моладзі Беларусі.

Таварыш Сталін загадаў:

«Партызанам і партызанкам наносіць моцныя ўдары па варожых тылах, шляхах зносін, воінскіх складах, штабах і прадпрыемствах, разбураць лініі сувязі праціўніка. Уцягваць шырокія пласты Совецкага насельніцтва ў захопленых ворагам раёнах у актыўную вызваленчую барацьбу, выратоўваючы тым самым совецкіх грамадзян ад угону ў нямецкае рабства і ад знішчэння гітлераўскімі звярамі. Помсціць бязлітасна нямецкім захопнікам за кроў і слёзы нашых жонак і дзяцей, мацярок і бацькоў, братоў і сясцёр. Усімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі ў яе барацьбе з подлымі гітлераўскімі прыгнятальнікамі».

Загад любімага правадыра—свяшчэнны закон для кожнага байца вызваленчай вайны совецкага народа.

Месца моладзі — у першых радах байцоў Радзімы. Моладзь выканае свой абавязак перад Радзімай. Насустрач ідучаму 25-цігоддзю БССР— выдатнейшай даце стварэння совецкай беларускай дзяржаўнасці, здабытай беларускім народам пад мудрым кіраўніцтвам Леніна — Сталіна, — моладзь Беларусі разам з усім народам нанясе ворагу сакрушальныя ўдары.

Мы ўпэўнены ў тым, што неўзабаве адваюем свабоду і шчасце роднай Беларусі і сатрэм фашысцкую погань з твару зямлі. Пакуль вораг лютуе на нашай зямлі, ніводзін з нас не можа

ні на хвіліну супакойвацца. Днём і ноччу павінен абрушвацца агонь партызан на ворага. Ні ў якім баю не павінны хібліць вока і рука маладога савецкага патрыёта, пасылаючы гарачую кулю прама ў сэрца фашысцкага звера.

На бой, моладзь Беларусі!





Кандрат КРАПІВА

# МІХАІЛ СІЛЬНІЦКІ



Ён мала пажыў. На дваццаць першым годзе аддаў Міша маладое жыццё, баронячы свой народ, сваю родную Беларусь ад фашысцкіх людаедаў. Міша бачыў радзіму ў крыві і пакутах, беларускія гарады ў руінах і попеле. Ён бачыў, як паміралі на фашысцкіх віселькях і пад нямецкімі кулямі савецкія людзі, вінаватыя толькі ў тым, што яны беларусы і не хочуць быць нямецкімі рабамі. Сэрца яго не магло знесці гэтай крыўды і здзеку. Малады пат-

рыёт пакляўся біцца з ворагам да таго часу, пакуль родная зямля не будзе ачышчана ад фашысцкай погані, калі зноў можна будзе вольна дыхаць чыстым паветрам родных палёў і лясоў.

Яго гарачая любоў да радзімы і пякучая нянавісць да нямецкіх акупантаў, яго беззаветная храбрасць і мужнасць зрабілі тое, што просты сялянскі хлопец, калгаснік, стаў Героем Савецкага Саюза, імя якога будзе жыць вечна ў сэрцы народа. Яго подвіг будзе натхняць людзей на новыя геройскія ўчынкі. 28 сакавіка 1942 года — дзень яго смерці — стаў днём яго славы і неўміручасці.

Міхаіл Сільніцкі нарадзіўся і пражыў дзіцячыя годы ў вёсцы Заполле, Суражскага раёна, Віцебскай вобласці. Хлопчык вызначаўся незвычайнай кіпучай энергіяй, цікаўнасцю і кемлівасцю. Ён хацеў сам усюды быць, усё бачыць і ўсё рабіць. Перашкод ніякіх не прызнаваў, страху не ведаў. Ён быў сваволны і гарэзны і, пакуль не падрос, з ім шмат было клопату і бацькам, і настаўнікам.

«Гора мне з ім было, — расказвае пра яго маці Вера Нікалаеўна Сільніцкая. — Бывала ні на адну хвіліну нельга пакінуць аднаго. Пасаджу за стол, дам есці. — Еш, Міша, ды не ідзі нікуды, я зараз прыду... — Пакуль я падаю карову, дык мой Міша ўжо на Дзвіне аж на пятым плыце. Стаўлю даёнку і бягу без памяці на раку. Клічу, клічу — ды ўсё ласачкай. Пагразі, дык ён на злосць табе і ў ваду можа бултыхнуць. Выманю, нарэшце, як-небудзь. Бывае, распераджу фартух дый паскамі пацягну са злосці. Просіцца: «Мамачка, не буду!» А праз хвіліну, як толькі адвярнуся, ужо сядзіць на страсе альбо на вяршэчку бярозы. Баялася за яго вельмі. Ён-жа тады яшчэ адзін быў у мяне. Ці паверыце, мусіла

ца ложка прывязваць, калі трэба было адлучыцца куды-небудзь з хаты».

Мішавы прыгоды не заўсёды канчаліся прыемна. Аднойчы Міша з цікавасцю наглядаў, як сусед робіць цэглу. Яму вельмі хацелася самому прыняць актыўны ўдзел у гэтай цікавай вытворчасці. Вось, нарэшце, зручны выпадак — сусед вылажыў цэглу сушыцца, а сам адышоўся. Міша з сваім сябрам, таксама Мішам, толькі гэтага і чакалі. Яны падышлі да цэглы. Міша паставіў нагу на цагліну і на ёй астаўся выразны адбітак яго нагі. Гэта хлопцам вельмі спадабалася, і яны ўзяліся за работу. Праз кароткі час на ўсіх двух тысячах цаглін красаваліся адбіткі дзіцячых ног. Тады хлопцам захацелася яшчэ памясіць гліну. Яны накіраваліся да ямы, у якой размакала залітая вадой гліна. Але тут ім не пашанцавала. Як толькі яны ўлезлі ў яму, гліна пачала іх засмоктваць. Сільніцкі сяк-так выбраўся, а яго сябар так заграз, што не мог крануцца з месца, і пачаў крычаць і прасіць ратунку. Прыбеглі абедзве маці. Паспрабавалі выцягнуць хлопца, але дзе там! У яго аж суставы хрусцяць, а ён не падаецца. Тады адна ўзяла хлопца падпахі, каб не ўехаў глыбей, а другая стала адкопваць рыдлёўкай. Ледзьве выратавалі.

Чым больш падрастаў Міша, тым больш кіпела ў ім энергія, тым больш складанымі і небяспечнымі станавіліся забавы хлопца. Мішаў бацька, вясковы каваль, стары і ўдумлівы чалавек, глядзеў на хлопца з непакоем і смуткам: «Што з яго выйдзе?» — думаў ён сабе. Лавіў Фёдар Іванавіч сінявокага, гарэзнага, рухавага, як жывое срэбра, хлопчыка, прыцягваў да сябе і спрабаваў угаварваць. Але Мішу нудна было слухаць бацькавы навучанні. Ён вырываўся з рук і бег, каб



Мал. І. Ахрэмчыка

дзе-небудзь устроіць новую штуку, а тым часам і сам не заўважаў, як бацькавы разумныя і ласкавыя словы западалі яму ў душу.

Паступова забавы і гульні Мішы рабіліся больш разумнымі і мэтанакіраванымі. Ён задумаўся над тым, кім ён хоча быць.

Жывучы на беразе Заходняй Дзвіны, Міша стаў выдатным плаўцом. Аднойчы бацька стаяў на беразе і з заміраннем сэрца глядзеў на штукі, якія Міша вырабляў у вадзе. Ныраючы, ён так доўга аставаўся пад вадой, што, здавалася, ніколі ўжо не вынырне. Калі Фёдар Іванавіч стаў дакараць сына, што ён так рызыкуе, Міша на гэта адказаў: «Маракоў прымушаюць гэта рабіць, ды колькі яшчэ абучаюць, а я, гуляючы, вучуся. Калі прыду ва флот, дык мяне і вучыць мала трэба будзе. Чаму-ж ты мне не дазваляеш?» Міша марыў быць чырвонафлотцам.

З вёскі Заполле сям'я Сільніцкіх пераехала ў суседняе сяло Курына, дзе бацька ўступіў у калгас і працаваў кавалём у калгаснай кузні. Міша стаў вучыцца ў няпоўнай сярэдняй школе. Яму лёгка ўсё давалася і ён добра вучыўся. Самыя горшыя адзнакі ў яго былі па дысцыпліне. Яго кіпучая энергія ніяк не мірылася са школьнымі правіламі. «Настаўнікі не разумеюць мяне, не ўмеюць са мной жыць» — скардзіўся Міша бацьку. А Фёдару Іванавічу балюча было гэта слухаць. Ён ішоў да настаўнікаў і доўга раіўся з імі, што зрабіць, каб даць разумны выхад празмернай энергіі сына. Парашылі, што яму павінна дапамагчы фізічная праца. Міша стаў наведваць школу цераз дзень, а астатнія дні памагаў бацьку ў кузні. Гэта спачатку як быццам памагло, а потым усё пайшло па-ранейшаму. Толькі гульні Мішы пачалі набываць выразна вайсковы характар.

Пры школе быў гурток Асоавіяхіма, у якім былі лыжы і малакаліберныя вінтоўкі. Міша стаў самым гарачым удзельнікам гуртка. Усе грошы, якія бацькі давалі яму на яду і на прысмакі, Міша прастрэльваў у ціры. Калі маці дакарала, яго за тое, што ён галодны цэлы дзень, Міша адказваў: «Чырвонай Арміі патрэбны снайперы. А што галодны — гэта нічога. Снайпер павінен быць трывалым!»

Каля Курына ёсць высокая гара — «Малінаўская». Гара гэта досыць крутая. На яе і ўлетку напрост цяжка ўзыйсці. А Міша катаўся з яе на лыжах. І калі ён на перапынку, ухапіўшы лыжы, узбіраўся на Малінаўскую гару, то тады ўсе вучні школы збіраліся паглядзець на выдатнае відовішча. Яны з зайздрасцю і захапленнем сачылі за ім. Кожны яго выкрутас выклікаў бурнае адабрэнне. Ніякія званкі тады не дзейнічалі, і настаўнікі павінны былі ўжыць энергічныя захады, каб сабраць вучняў у класы і пасадзіць на парты. А Мішу тым часам зніжалі адзнаку па дысцыпліне.

Калі Мішу не давалі лыж, ён арганізоўваў спаборніцтва ў бегу — ад аднаго тэлефоннага слупа да другога. Сам раздаваў узнагароды пераможцам і сароміў адсталых. Страсці разгараліся, час ішоў, пра ўрок забывалі, і настаўнікі зноў умешваліся і адзнака па дысцыпліне ў Мішавым дзённіку зноў паўзла ўніз.

К 18 гадам Міша быў спрытным, стройным і дужым юнаком. На вечарынках ён быў першым танцорам і песеннікам, любіў беларускія песні і танцы і быў заўсёды душой вясёлай маладой кампаніі. На спартыўных спаборніцтвах ён звычайна заставаўся пераможцам. За работу браўся, і работа кіпела ў яго руках.

Улетку Міша працаваў сезоннікам: на цагляным заводзе, на водным транспарце, на ваенным будаўніцтве. Разам з тым ён наведваў вячэрнія шоферскія курсы і добра вывучыў матор.

Зімою Міхась працаваў з бацькам у кузні. Ён быў ужо выдатным кавалём і добрым слёсарам. За зіму ўдвух з бацькам яны прыводзілі ў парадак увесь калгасны інвентар і вясна ніколі не заставала калгас «Шлях Леніна» непадрыхтаваным. Калі шмат збіралася работы, Міхась здымаў з галавы шапку, як толькі ён умеў гэта рабіць, і гаварыў: «Ну, стары, сёння я табе закурыць не дам» — і браўся за работу. Ды так браўся, што бацьку сапраўды не было калі закурыць. Асабліва любіў Міша коні каваць. Бацька ледзь паспяваў падрыхтоўваць яму падковы. Міша рабіў гэту работу так спрытна і хутка, што маці глядзела на яго са страхам. Яна баялася, што Міша скалечыць каню нагу. Але з ім гэтага ніколі не здаралася.

У 1938 годзе Сільніцкі ўступіў у комсамол і быў актыўным комсамольцам. У маі 1941 года ён быў прызваны ў Чырвоную Армію, а праз месяц маладому танкісту прышлося прымаць удзел у жорсткіх баях, адбіваючы націск гітлераўскіх орд.

У часе адной контратакі Міша быў паранены. Бой быў жорсткі і цягнуўся шэсць гадзін, але ўрэшце праціўнік прымусіў адыйсці нашу часць на зыходныя пазіцыі. Сільніцкага нельга было вынесці з поля бою і ён трапіў у палон.

Тут ён упершыню ўбачыў сваімі вачыма здзекі і пакуты, якім падвяргаюць нямецкія варвары савецкіх людзей. Сам ён цярпеў гэтыя страшэнныя пакуты.

Нягледзячы на позняю восень, палонных трымалі на двары, за агарожай з калючага дроту.

Людзі мерлі, як мухі, ад прастуды, ад загніўшых ран, ад голаду. Замест стравы немцы ўвалакалі ў загароду труп здохлага каня і ашалелыя ад голаду людзі кідаліся на гэту здыхляціну. За кожны падазроны рух, за намёк на пратэст фашысцкія звяры расстрэльвалі палонных на месцы.

З жахам і нянавісцю глядзеў Міша на зверствы гітлераўскіх бандытаў. Ён рашыў — уцяку: альбо свабода, альбо смерць.

Сільніцкі стаў асцярожна загаварваць з суседзямі і хутка знайшоў аднадумцаў. У лагеры быў адзін камандзір Чырвонай Арміі, які ўжо даўно думаў і рыхтаваўся ўцякаць. Раз яго жонцы ўдалося перадаць яму ў збанку з малаком ножны для рэзкі дроту. Ноччу ў далёкім кутку загароды, дзе менш хадзіла варта, быў прарэзан дрот і Сільніцкаму разам з вялікай групай палонных удалося ўцячы. Вартавыя, праўда, схамянуліся і адкрылі агонь. Частка ўцекачоў была забіта, але іншыя апынуліся на волі.

Пераапрануўшыся ў сялянскую вопратку, Сільніцкі пайшоў са Смаленшчыны на Віцебшчыну ў родную вёску, дзе свае людзі маглі-б схаваць яго ад праследвання, дзе ён меў-бы магчымасць папravіцца і падужэць пасля перанесеных пакут і галадоўкі.

Па дарозе Сільніцкі два разы ледзь не трапіў зноў у лапы фашысцкіх катаў.

Раз на Віцебшчыне паміж вёскамі Янавічы і Тадуліна Сільніцкі нечакана сустрэўся з атрадам нямецкіх карацеляў. Уцякаць было позна, ісці насустрач немцам азначала ісці на немінучую пагібель. На шчасце выручыла жанчына, якая ішла па гэтай-жа дарозе. Бачачы, што Сільніцкі баіцца трапіць у лапы нямецкіх жывадзёраў, жанчына дала яму на рукі дзіця, а сама з кашолкай пайшла

побач з ім, быццам яго жонка. Так яны прайшлі праз вёску і ніхто да іх не прычапіўся.

Другі раз небяспека пагражала яму ў калгасе, у якім ён спыніўся па дарозе і нейкі час працаваў кавалём. Шукаючы палонных, у вёску прыехалі немцы і выстраілі ўсіх мужчын.

— Хто не з гэтага калгаса, выйдзі! — скамандаваў афіцэр.

Баючыся, каб праз яго не панеслі кары калгаснікі, Сільніцкі памкнуўся быў выйсці, але старшыня калгаса ўхапіў яго ззаду за вопратку і ўтрымаў на месцы. Немцам старшыня заявіў, што гэта яго сын, і што ён будзе жыць і працаваць разам з ім. Так яшчэ раз выратаваўся Сільніцкі ад смерці, дзякуючы добрым людзям, савецкім патрыётам, якія самі рызыкавалі жыццём дзеля яго паратунку.

Прышоўшы ў родную вёску Курына, Міхась Сільніцкі патроху працаваў з бацькам у кузні, а тым часам звязаўся з людзьмі, якія складалі ядро партызанскага атрада. Сярод іх быў таварыш Р. — камандзір атрада і тав. М. — камісар атрада, былы старшыня калгаса.

Таварышы патроху выяўлялі і вербавалі кадры, бралі на ўлік зброю, якая заставалася пасля адходу Чырвонай Арміі і была закапана насельніцтвам. Але ўсё гэта рабілася патаемна, справу мелі толькі з людзьмі пэўнымі, праверанымі. Нават мацеры Міша не гаварыў пра свае справы. Маці пыталася часамі — «Дзе ты ўсё ходзіш, Міша?» Ён на гэта, не то жартуючы, не то сур'ёзна, адказваў: «Гэта ваенная тайна».

Адзін бацька дагадваўся, дзе начамі прападае Міша. Часамі ў кузні ён асцярожна пачынаў пра гэта гаворку з сынам, але Міша заўсёды адказваў.

— Пачакай, бацька, хутка ўсё будзеш ведаць.

Пры гэтым ён яшчэ энергічней біў молатам па напаленым жалезе і залатыя пырскі разляталіся ва ўсе бакі.

Тым часам пайшлі чуткі, што Чырвоная Армія перайшла ў наступленне, што немцы пад Масквой разбіты і адступаюць. Людзі збіраліся групкамі ўпотай і падоўгу гаварылі аб тым, хто што чуў, падвяргалі крытыцы фашысцкую брахню і разыходзіліся па сваіх хатах з надзеяй на хуткае вызваленне. Па начах выходзілі на двор і падоўгу прыслухоўваліся, ці не пачуюць стрэлы гармат.

Аднаго разу да Курына дакаціўся далёкі гарматны гул. Гэтыя гукі смерці і разбурэння, якія заўсёды наводзілі жах на людзей, цяпер былі ўспрыняты, як вястуны доўгачаканай свабоды. Людзі падымалі вышэй галовы і весялей глядзелі на свет. Яны ўсміхаліся самі сабе і гэта ўсмешка была кожнаму зразумела.

Вось у гэтыя дні аднаго разу Міша прыйшоў дадому з вінтоўкай на рамяні. Ён сказаў, што Чырвоная Армія зусім блізка, што ў Курына прыходзілі разведчыкі Чырвонай Арміі і наладзілі сувязь з партызанамі і што цяпер ужо няма чаго асабліва баяцца.

— Усё-ж такі асцерагайся, сынок. Так і загінуць нядоўга, а табе-ж яшчэ толькі жыць і жыць, — казала яму Вера Нікалаеўна.

— Усёроўна, мама: дваццаць год жыві — жыць хочацца, сто год жыві — таксама жыць хочацца. Але каб па-людску жыць. А пад немцамі хіба жыццё? Лепш загінуць з гонарам за сваю радзіму, чым жыць з ганьбай,—адказаў на гэта Міша.

Гаворачы, што цяпер ужо няма чаго асцярагацца і хавацца, Міша памыляўся. Пад уражан-

нем сустрэчы з чырвонаармейскай разведкай ён гатоў быў пераўменшыць небяспеку. На самай справе баявое жыццё партызан было цяжкім і небяспечным. Праўда, што цяга ў партызанскія атрады значна павялічылася і атрад т. Р., які налічваў дагэтуль некалькі чалавек, хутка стаў расці і вырас у грозную сілу. Праўда і тое, што паліцэйскія і ўсе іншыя халуі фашыстаў павесілі насы. Самі акупанты таксама спахмурнелі і сталі баязліва азірацца па баках, чуючы блізкую пагібель. Але ад гэтага яны сталі яшчэ больш лютымі. Фашысты яшчэ больш жорстка сталі распраўляцца з мірным насельніцтвам і пасылалі шматлікія карныя атрады, спадзяючыся адным ударам справіцца з партызанамі.

Але партызаны карысталіся падтрымкай і дапамогай насельніцтва і справіцца з імі акупантам было не так лёгка. Ніякія зверствы і катаванні не дапамаглі. Наадварот, чым больш лютавалі фашысцкія выродкі, тым больш народных мсціўцаў браліся за зброю, каб адплаціць ненавіснаму ворагу за здзекі і пакуты нявінных людзей.

Аднойчы ў пасёлак Ноўкі ўварваўся атрад карацеляў. Яны сагналі ў адно месца ўсіх, хто не паспеў уцячы, і пачалі допыт.

— Комуністы і партызаны, выйдзіце!—скамандаваў афіцэр.

Ніхто з месца не крануўся. Афіцэр сціснуў зубы.

— Ага, значыць, паміж вас партызан няма? Тады скажыце, дзе яны?

Усе маўчалі, ніхто не вымавіў ні слова.

— Ах, так! Ну, вы ў мяне зараз загаворыце,— пагразіў афіцэр і аддаў загад па-нямецку.

Тады да шарэнгі людзей падышоў обер-ефрэйтар і, тыкаючы кожнаму пальцам у грудзі, пачаў з правага флангу адлічваць.

— Айн, цвай, драй, фір...

Кожнага пятага ён хапаў за грудзі і вывалакаў з шарэнгі. Няшчасных расстралялі тут-жа, на вачах у астатніх і афіцэр зноў звярнуўся да шарэнгі.

— Цяпер вы, напэўна, скажаце, дзе партызаны.

Але зноў ніводнага слова не пачуў ён у адказ, і зноў обер-ефрэйтар пачаў лічыць з правага флангу.

— Айн, цвай, драй...

Цяпер ён вывалакаў з шарэнгі кожнага чацвертага. І іх таксама расстралялі на вачах у ўсіх. Калі і пасля гэтага ніхто не вымавіў ні слова, раз'юшаны афіцэр крыкнуў:

— Вы ўсе партызаны! Усіх расстраляць!

Так геройскі загінулі некалькі дзясяткаў патрыётаў — мужчын і жанчын пасёлка Ноўкі. Кожны што-небудзь ведаў пра партызан, але сярод іх не знайшлося ніводнага здрадніка.

Не могучы ўзяць партызан сілай, акупанты пускаліся на ўсялякія хітрыкі. Часта яны падсылалі шпіёнаў да сваякоў і знаёмых партызан, каб пранюхаць, дзе яны знаходзяцца.

Раз у дом Сільніцкага зайшла жанчына.

— Ці не знойдзецца ў вас сена прадаць хоць пудоў колькі? — запыталася яна. — Кароўчыну яшчэ ўхавала ад немцаў, дык карміць няма чым.

А перад гэтым якраз партызаны адбілі ў немцаў склад з сенам і раздалі яго сялянам.

— Дзе тое ў нас сена, — адказала Вера Нікалаеўна. — Схадзіце вунь у тую вёску, за раку, там лугі вялікія. А ў нас якое-ж сена. — А сама падумала: «Дарэмна ты, мілая, прыкідваешся сіратою. Ведаю я, чаго табе трэба».

У гэты час па вуліцы праехала фурманка, а на ёй некалькі чалавек узброеных, у сялянскай вопратцы. Жанчына так і прыліпла да акна. Адзін з тых, што сядзеў на возе, павярнуўся тварам да хаты, але, заўважыўшы ў акне незнаёмую жанчыну, хутка адвярнуўся. Усю справу ледзь не сапсаваў малы Коля.

— Мамачка, наш Міша паехаў, — крыкнуў ён у захапленні. Маці так і ўмлела.

— Які табе Міша, што ты выдумаў, — сказала яна лагодна.

— Дальбог, Міша! Я па галаве пазнаў,—стаяў на сваім Коля.

— Дурны ты, гэта табе здалося. Міша наш далёка-далёка. Ён сюды не можа прыехаць, — угаворвала Колю Вера Нікалаеўна, стараючыся гаварыць як мага спакайней.

Міша забягаў дадому толькі на кароткі час, змяніць бялізну, ды праведаць, ці здаровы. Цяпер ледзь не кожны дзень адбываліся сутычкі атрада з акупантамі і дыверсіённыя акты — падпалы складаў, падрывы мастоў і чыгуначнага палатна. Усё гэта не адбывалася без Мішы Сільніцкага. Усюды ён быў самым актыўным і адважным.

Уступіўшы ў партызанскі атрад, Міша адразу-ж узяўся вывучаць трафейную зброю, якой больш за ўсё было на ўзбраенні атрада. Так за некалькі дзён ён дасканала вывучыў нямецкі станковы і ручны кулямёт. Пасля гэтага стаў абучаць таварышоў і падрыхтаваў аддзяленне кулямётчыкаў.

Міша страшэнна не любіў сядзець на месцы і заўсёды шукаў сустрэчы з ворагам. Калі праходзіла некалькі дзён без схваткі з фашыстамі, ён прыходзіў да камандзіра атрада і прасіў даць яму «работу». Пры гэтым ён уносіў шэраг прапа-

ноў і сам вызываўся на аперацыі, якія патрабавалі вялікай адвагі і спрыту.

Такім чынам ён аднойчы прабраўся ў занятую немцамі вёску Жалезнякі і з-пад носа ў акупантаў вынес два кулямёты і сем вінтовак, якія былі схаваны жыхарамі. Другі раз Сільніцкі разам з партызанам К. уварваўся ў вёску Прысушына, дзе было 40 фашыстаў, і адкрыў па іх агонь з кулямёта. Восем гітлераўцаў былі забіты, а астатнія разбегліся.

У баю Сільніцкі вызначаўся вялікай адвагай і ініцыятыўнасцю. Раз, каля вёскі Астраўскія, партызаны вялі бой з атрадам фашыстаў колькасцю ў семдзесят чалавек. Сільніцкаму даручана было зайсці немцам у фланг і падтрымаць кулямётным агнём наступленне партызан. Міша па сваёй ініцыятыве спусціўся на лёд Заходняй Дзвіны і, прыкрываючыся высокім берагам, зайшоў фашыстам у тыл. Раптоўна адкрыўшы агонь з блізкай адлегласці, ён пасеяў паніку сярод фашыстаў, і тыя кінуліся ўцякаць, усцілаючы поле дзесяткамі трупаў.

Кулямёт сабе Міша здабыў у баю. Бой быў гарачы і ўпарты. Гітлераўцаў было значна больш, чым партызан, і яны нахабна лезлі ўперад. Асабліва дакучаў нямецкі кулямёт, які паліваў свінцом пазіцыі партызан. Міша ляжаў за пнём і адну за другой пасылаў трапныя кулі ў наступаючых фашыстаў. І тут кулямётная чарга ўзвіхрыла снег побач з ім, другая прасвістала над галавой: нямецкі кулямётчык страляў па ім. Злосць узяла Мішу. Ён рашыў расквітацца з фашыстам. Скінуўшы пінжак і шапку, Міша палажыў іх ля пня на віду ў нямецкага кулямётчыка, а сам паўзком стаў падбірацца да гітлераўца.

Калі Міша непрыкметна падпоўз да немца, той усё яшчэ страляў па мішавай вопратцы. Прыкончыўшы фрыца адным ударам, Міша захапіў кулямёт, скрынку з патронамі і вярнуўся да сваіх.

З гэтым кулямётам Міша не раставаўся да канца сваіх дзён і нямала фашысцкіх вырадкаў лягло ад яго трапных стрэлаў. З гэтым-жа кулямётам Міша быў і ў апошнім сваім баю.

Гэта было 28 сакавіка 1942 года. Для знішчэння партызанскага атрада нямецкае камандаванне выслала карны атрад колькасцю каля 4-х рот. У немцаў была адна супроцьтанкавая гармата, пяць мінамётаў рознага калібра, 13 ручных і станковых кулямётаў, 50 аўтаматаў. Рэшта фашыстаў была ўзброена вінтоўкамі. Яны збіраліся знянацку напасці на партызан у раёне шклянога завода Ноўкі і знішчыць іх.

Камандзір партызанскага атрада тав. Р. загадзе ўведаў аб намерах фашыстаў. Яшчэ напярэдадні яму аб гэтым данесла яго разведка. Міша таксама ведаў пра гэта. 27-га сакавіка ён ездзіў у разведку здабываць весткі пра карацеляў.

У партызанскім атрадзе было ўсяго паўтараста байцоў, чатыры кулямёты і дваццаць пяць аўтаматаў. Але таварыш Р. рашыў даць бой карацелям. Ён распалажыў сваіх байцоў у раёне вёскі Плоты так, каб знянацку ўдарыць па фашыстах з фронта і з флангаў. Аднаму кулямётнаму разліку ён загадаў распалажыцца на ўскраіне вёскі Плоты і па сігналу чырвоная ракета ўдарыць у тыл карацелям. Гэта заданне было дадзена самаму стойкаму і храбраму партызану Міхаілу Сільніцкаму. Міша са сваім разлікам распалажыўся на вышках крайняй хаты. Адгэтуль відаць была вёска Курына, дзе прайшлі яго юнацкія годы і хлапецкія гульні. Цяпер там ас-

таліся бацька і маці, сястра і меншыя браты, якім пагражала страшэнная небяспека ад гітлераўскіх разбойнікаў. Крыўдна стала Мішу за сябе, за сваю сям'ю і родную вёску, за родную Беларусь, якой стаў на грудзі кованы фашысцкі бот. Ён ляжаў за кулямётам і цярпліва чакаў.

На павароце дарогі паказаўся галаўны дазор немцаў. Партызаны яго прапусцілі, не выдаючы свайго месцазнаходжання, і падрыхтаваліся да бою. За дазорам ішлі асноўныя сілы карацеляў. Сцепаючыся ад холаду, паўбіраўшы галовы ў плечы, немцы пляліся за санямі, на якіх ляжала іх зброя. Яны падышлі ўжо на сто метраў, а партызаны ўсё не адкрывалі агню. Толькі калі фашысты падышлі метраў на пяцьдзесят, партызаны раптам секанулі па калоне з кулямётаў, аўтаматаў і вінтовак.

Шмат фашыстаў лягло трупамі. Яшчэ больш курчылася ад болю, сплываючы крывёй. Астатнія кінуліся ў бакі. Але і тут іх касілі партызанскія кулі. Здагадаўшыся, што яны трапілі ў агнявы мяшок, фашысты кінуліся назад. Тады ўзвілася чырвоная ракета і загаварыў кулямёт Сільніцкага. Праз кароткі час шэсцьдзесят трупаў нямецкіх салдат і афіцэраў валяліся на снягу. Але і становішча Сільніцкага было крытычным. Немцам другога выхаду не было, як толькі прарвацца назад. Тут быў толькі адзін кулямёт. Фашысты гэта заўважылі і насядалі ўсё мацней. У Сільніцкага засталося ўсяго тры стужкі патронаў і ён вёў агонь вельмі эканомна: толькі калі фашысты падымаліся на ўвесь рост, даваў па іх кароткую чаргу.

Калі ў Сільніцкага засталася толькі адна стужка патронаў, да фашыстаў падышло падмацаванне. Сільніцкі апынуўся ў агнявым кальцы.

Ён біўся да апошняга патрона і, калі больш не было чым страляць, рашыў адыйсці да сваіх. У час перабежкі куля прашыла яму нагу. Ён упаў і папоўз, цягнучы за сабой кулямёт. Гітлераўцы ўзрадаваліся і рашылі ўзяць адважнага партызана жывым.

Калі яны сталі падпаўзаць да яго, Сільніцкі выхапіў наган і стаў расстрэльваць немцаў з блізкай адлегласці. У гэты час куля прабіла яму правую руку. Сільніцкі бачыў, што яму ўжо не выратавацца, што прышоў яго канец, але малады патрыёт і не думаў здавацца. Ён рашыў біцца з ненавіснымі ворагамі да апошняга дыхання. Ён узяў наган у левую руку і, калі фашысты падпаўзлі на пяць метраў, выпусціў два апошнія патроны. Два гітлераўцы былі забіты напавал. Тады Сільніцкі выхапіў фінку, кінуўся на фашыстаў і закалоў яшчэ двух вырадкаў.

Зранены, сплываючы крывёй, ён біўся да апошняга дыхання, пакуль не перастала біцца яго мужнае сэрца. Так загінуў адзін з лепшых сыноў беларускага народа, комсамолец, партызан-кулямётчык Міхаіл Фёдаравіч Сільніцкі.

Немцы адышлі, панёсшы вялікія страты ад партызан. Яны нават не здолелі забраць усіх трупаў сваіх салдат. Назаўтра цэлы дзень над месцам бою кружыліся нямецкія самалёты. Людзі чакалі, што вось-вось немцы прыедуць забіраць сваіх забітых. Бацькі даведаліся аб смерці Мішы 29-га зранку. Калі сцямнела Фёдар Івановіч крадкам завёз труп Мішы да сваіх знаёмых у суседнюю вёску Заполле, дзе Міша нарадзіўся і жыў у маленстве. Сюды сярод ночы сышліся людзі з суседніх вёсак—Кулакова, Кабыльнікаў, Плотаў, каб назаўсёды развітацца з курынскім хлопцам Мішам Сільніцкім, якога яны так любілі

за кіпучую натуру і чулае сэрца, за вясёлы характар, за песні, за танцы, за геройства і вернасць народу.

Людзі прынеслі ядлоўцавыя вянкі, кветкі, зробленыя з каляровай паперы. Адна дзяўчына з вёскі Плоты прынесла шырокую блакітную стужку. Як толькі маглі, прыбралі дзяўчаты Мішу ў апошняе падарожжа.

Мужчыны, нягледзячы на вялікую небяспеку трапіць пад нямецкія кулі, пайшлі ноччу на Курынскі могільнік капаць магілу. На досвітку камякі сырога жвіру глуха ўпалі на сасновае века труны.

Цяпер над скромнай мішавай магілай шумяць пасаджаныя клапатлівай рукой бярозкі і кусцікі бэзу. Але недалёка той час, калі над радзімай Мішы Сільніцкага зноў будзе развявацца чырвоны сцяг. І тады ў яго роднай вёсцы, на высокім беразе Заходняй Дзвіны, будзе пастаўлены помнік Герою Совецкага Саюза Міхаілу Сільніцкаму, і падарожны з пашанай прачытае на пастаменце кароткі надпіс аб яго подвігу. І плытагоны, зняўшы шапкі, праплывуць міма яго, і разам з імі ўніз па Дзвіне, аж да самага Балтыйскага мора паплыве легенда аб подвігу маладога патрыёта. Слава аб ім будзе перадавацца з пакалення ў пакаленне і будзе запальваць у сэрцах людзей гарачую любоў да сваёй радзімы, да свайго народа і яго слаўных сыноў.



Пятро ГЛЕБКА

## ДА МОЛАДЗІ

Узгадаваныя на волі, —
Пад сонцам сталінскай вясны,
Вы не згіналі плеч ніколі,
Свабодалюбныя сыны.

Вам з нараджэння невядома
Нядоля палкі і ярма.
І вось над вашым мірным домам
Навісла рабства і турма.

І вашы светлыя надзеі,
І вашу радасць без тугі,
З-пад чорнай хмары ліхадзеі
Закуць імкнуцца ў ланцугі.

Няўжо-ж вы схіліце калені,
Сябры геройскіх мужных спраў,
Каторым даў свабоду Ленін,
Каторым Сталін шчасце даў?

Не! На узгорках і між долаў
Магутны чую ваш адказ:
— Не схіліць той пакорна голаў,
Хто зведаў волю хоць-бы раз.

Паўстань-жа моладзь Беларусі,
Сыны рабочых і сялян,
Супроць няволі і прымусу
Гуртуй атрады партызан!

Няхай зазвоняць пушчы зброяй,
Хай зашумяць агнём лясы,
Няхай ад вашых рук, героі,
Канаюць гітлераўцы — псы.

Ізноў тады над вашым домам
Заззяе радасць, шчасце й мір
І светлым поглядам знаёмым
На вас паглядзіць правадыр.

★



Кузьма **ЧОРНЫ**

# ЖЭНЯ ПАЛТАЎСКАЯ

Яна яшчэ толькі ўвайшла ў сваё юнацтва, у самую лепшую пару чалавечага жыцця. Вырасла яна ў совецкія часы. Эксплаатацыі чалавека чалавекам, прыніжэння чалавечай асобы яна не бачыла і не ведала. Як патрэба вады ў гарачую смагу, як спелы колас у канцы лета—так шчасце жыць у сваёй Радзіме было натурай для Жэні Палтаўскай, народнай гераіні, ясны вобраз якой зліваецца з вобразам усяго народа, з душой народа. Маладое жыццё яе загубілі гітлераўскія вылюдкі, жыццё яснае і радаснае, якое дала ёй совецкая краіна. У пару самых лепшых маладых імкненняў і надзей перад Жэняй Палтаўскай паўстала суровая неабходнасць аддаць жыццё за родную Совецкую краіну. Толькі так магла стаяць справа: у душы пакалення гэтай маладой совецкай дзяўчыны жыве праўда таго, што шчаслівае жыццё мысліцца толькі як жыццё ў такой краіне, якую чалавек пазнаў з маленства пасля Кастрычніка 1917 года.

Комсамолка Жэня Палтаўская была студэнткай мастацкага вучылішча. Пачалася вайна. Во-

раг рваўся на ўсход. Пад Смаленскам тысячы савецкіх людзей узводзілі ўмацаванні. Жэня добраахвотна пайшла на гэтую неабходную Радзіме справу. Дзень пры дні яна працавала з рыдлёўкай на земляных работах. З ранку да вечара бачылі яе сярод занятых цяжкай працай людзей. Сваёй рыдлёўкай яна то пад спёкай, то пад дажджамі выкідала наверх грунт.

Надышла восень. Вораг люта рваўся да Масквы. Жэня была цяпер у Маскве. Савецкія патрыёты бралі зброю і ішлі на дапамогу Чырвонай Арміі. Яшчэ не сышлі мазалі з жэніных рук пасля земляных работ. У іншы-б раз спрацаваныя рукі і плечы прасілі-б адпачынку, але цяпер маці-Радзіма клікала сваіх дзяцей на вайну супроць крывавага чужынца. Жэня Палтаўская ўзяла ў рукі вінтоўку і разам з групай моладзі пайшла да лініі фронта. Гэта было 4-га лістапада 1941 года.

Восем маладых герояў, сярод якіх была і Жэня, мелі на ўвазе перайсці лінію фронта і зайсці ворагу ў тыл. Фронт перайшлі. Пайшлі далей, браліся да штаба нямецкага войска. Непадалёку ад Валакаламска, на могільніку, наткнуліся на нямецкую засаду. Немцаў было ў дзесяткі разоў больш, аднак-жа маладыя героі не даліся ворагу. Пачалася перастрэлка. Біліся пакуль былі патроны. Немцы выклікалі падмацаванне, акружылі і забралі ўсіх, калі ў іх ужо не было чым страляць і некаторыя былі паранены. Палонных павялі ў Валакаламск. Паставілі ўсіх на двары, далёка адзін ад другога. На допыт уводзілі ў дом па-адным. Дапытваў нямецкі генерал. Жэня не ведала, як і аб чым дапытвалі тых, каго выводзілі раней за яе. Яна не ведала і што адказвалі таварышы на допыце. Яна нічога аб гэ-

тым не ведала. Яна маўкліва чакала свае чаргі. Нарэшце ўвялі ў дом і яе. Генерал сказаў ёй:

— У вас, мусіць, ёсць маці?

Гітлераўскі гад, пачынаючы допыт, думаў разварушыць душу маладой дзяўчыны, якая вялікай практыкай апошніх месяцаў пазнала жыццё ва ўсіх гранях яго суровай праўды, але на твары і ў вачах якой так многа было яшчэ дзіцячай наіўнасці. Чыноўны нямецкі кат думаў давесці да смутку аб жыцці і да болю маладую душу, каб тады залезці ў яе сваімі гадаўскімі капытамі.

— Так, у мяне ёсць маці, — ціха адказала Жэня.

— Вам шкода сваёй маці? — спытаў гітлераўскі генерал.

— Вы лепш сябе пашкадуйце, — адказала Жэня.

— Хіба вы не баіцеся смерці?—спытаў немец.

— Хочацца жыць,—адказала Жэня,—але, калі трэба памерці за Радзіму — памру.

Усе намыслы гітлераўскага прахвоста разбіліся аб мужную душу савецкай дзяўчыны, як аб цвёрдую скалу. Нічога не дазнаўся, нічога ён не выпытаў. У страшнай ярасці ён загадаў пакараць усіх восем чалавек смерцю.

Усіх паставілі ў шарэнгу. За іх плячыма сталі нямецкія салдаты, стрэлілі, 7 чалавек упалі. Восьмы павярнуўся тварам да людзей, якіх немцы сагналі глядзець на гэты крывавы малюнак.

— Дарагія, не пакутуйце за нас, знішчайце фашыстаў праклятых! Не бойцеся. Чырвоная Армія прыдзе!—крыкнуў ён людзям.

Некалькі параненых паднялося і з імі Жэня.

— Няхай жыве наша Радзіма!

— Смерць нямецкім катам!

Такі быў перадсмяротны кліч герояў. Зноў залп з аўтаматаў. Немцы пачалі расстрэльваць комсамольцаў, а пасля пацягнулі іх да шыбеніцы. З шыбеніцы іх знялі чырвонаармейцы, калі выгналі з Валакаламска нямецкую навалач. Чырвонаармейцы іх пахавалі. Восем герояў пасмертна ўзнагароджаны ордэнамі Леніна.

Жэня Палтаўская!

Слаўная дачка совецкага народа!

Хіба можа словы народнай пахавальнай песні, створанай вякамі ў нетрах народа, могуць вычарпаць глыбіню болю нашай душы, глыбіню замілавання і пашаны да твае светлай памяці:

«Ніц падаю лістам у лесе»—перад памяццю аб табе, перад тваім імем!

Ты—гордасць народа! Ты—слава яго—і цяпер, у вялікім змаганні, і ў блізкай будучыні нашай, калі разбітае Чырвонай Арміяй нямецкае звяр'ё сваімі касцямі ляжа пад нашы ногі.



Якуб КОЛАС

## ДУШОЮ І СЭРЦАМ МЫ З ВАМІ, ГЕРОІ

Душою і сэрцам мы з вамі, героі,
Сыны дарагія, наш цвет!
Вы множыце славу совецкае зброі,
З надзеяй на вас глядзіць свет.

Драпежныя орды пад вашым ударам,
Як скрышаны лёд, растаюць;
Рыхтуйце-ж магілы фашысцкім пачварам,
Змятайце нямецкую муць!

Ад фінскіх узгор'яў, з Дунаю і Прута,
Паўзе саранчою брыда;
І ўсё пажырае, знішчае ўсё люта
Галодная зграя, арда.

Руіны, пажары іх значацца следам,
І ўсюды нявінная кроў,
Не шкода дзяцей і жанчын людаедам,
Не шкода ім сёл, гарадоў.

Бандыт і грабежнік, звяруга шалёны,
Фашысцкая чорная вош;
Дык што яму права, людскія законы,—
Закон яго — доўбня і нож.

Такіх цемрашалаў не знаў свет ніколі.
Адпомсцім-жа гаду, за здзек.
І чэрап «арыйскі» на стоптаным полі
Навек пахаваем, навек.

Душою і сэрцам мы з вамі, героі,
Краса наша, гордасць і цвет!
Вы множыце славу чырвонае зброі,
З надзеяй на вас глядзіць свет.

★

Я. МАКАРЭНКА

## ДЗЯЎЧЫНА Ў ШЫНЯЛІ

Апранутая ў шэры паходны шынель, сціснутая ў таліі, абутая ў цяжкія ялавыя боты, яна падобна на сапраўднага ваеннага. Светлыя вочы глядзяць сурова і рашуча. Адкрыты і просты абветраны твар дыша ўнутраным супакоем.

Франтавое жыццё многае змяніла ў натуры і ў абліччы медыцынскай сястры Лены Жаваранкавай. Шматлікія пацыенты яе сельскага ўрачэбнага ўчастку ў Палессі, дзе яна працавала акушоркай, не пазналі-б у гэтым ваенным чалавеку сваёй комсамолкі Лены. Хіба толькі выдалі-б яе русыя непакорныя валасы, якія выбіваюцца з-пад пілоткі, ды ўсмешка маладосці і жыццёрадаснасці.

Баявое хрышчэнне Жаваранкава атрымала на адным з участкаў Заходняга фронта. Ішлі першыя дні баёў. Групе медыцынскіх работнікаў было даручана эвакуіраваць з прыфрантавой паласы шпіталь. Лена працавала, не складаючы рук. Вораг ноччу стаў бамбіць шпіталь. Свісталі асколкі. Пад градам гэтых асколкаў Жаваранка-



Мал. Е. Красоўскага

ва бясстрашна перавязвала параненых, укладвала іх з дапамогаю сяброўак у машыны.

У разгар бою ў цемры Лена ўбачыла лейтэнанта з маленькай дзяўчынкай на руках. На падранай дзіцячай сарочцы чырванелі плямы засохлай крыві. Стрымліваючы слёзы, лейтэнант расказаў страшэнную быль. Праходзячы са сваёй часцю праз родную вёску, ён зайшоў наведаць сваю сям'ю. Але замест хаты ён убачыў руіны. Сярод іх лейтэнант знайшоў забітых жонку, сына і непрытомную маленькую дачку. Урачы і сёстры спынілі на міг работу,—так узрушыў іх расказ лейтэнанта.

Лейтэнант падаў сястры дзяўчынку, якая яшчэ не апрытомнела, і голасам, поўным рашучасці і помсты, сказаў:

— Клянуся табе, дачка мая, я адпомшчу пракляхым звярам за тваю маці, брата і ўсіх забітых жанчын і дзяцей!

Словы лейтэнанта прагучэлі грознай клятвай і для Лены Жаваранкавай. Перамагаючы падступіўшыя да горла спазмы, глытаючы слёзы, яна дала сабе слова: чэсна і самаадцана працаваць на фронце. Сэрца яе напоўнілася кіпучай нянавісцю да фашысцкіх людаедаў.

З таго часу прайшло многа дзён, але ўспамін той страшнай ночы не пагас. Ён жывы, ён прымушае часцей біцца сэрца, мацней сціскаць рукі, ён паклаў на твар дваццацітрохгадовай дзяўчыны ледзь прыкметныя маршчынкі. Медыцынская сястра Жаваранкава цвёрда выконвае сваю клятву.

Дні на фронце ідуць грозныя і напружаныя. Разам з імі да сельскай акушоркі прышлі вопыт

і навык, рашучасць і ўменне дзейнічаць у любой абстаноўцы. Баявыя справы медсястры Лены Жаваранкавай сталі шырока вядомы.

Аб простай дзяўчыне ў шэрым шынялі з любоўю гавораць на фронце і ў тыле. Яе подвіг служыць прыкладам для тысяч медыцынскіх работнікаў Дзеючай арміі. Аб ёй усхвалявана гаварыла ў сваім выступленні на жаночым антыфашысцкім мітынгу ў Маскве прыбыўшая з фронта медсястра тав. Сакалоўская.

Чым-жа праславілася Лена Жаваранкава?

У раёне горада Ярцава немцы высадзілі дэсант. Пад прыкрыццём ночы фашысцкія паганцы наблізіліся да палатна чыгункі і пачалі абстрэльваць яго з мінамётаў. Рух на чыгунцы быў спынены. Санітарны поезд з некалькімі сотнямі параненых, у якім ехала медсястра Жаваранкава, аказаўся адрэзаным.

Немцы былі зусім блізка. Яны занялі прыдарожны лес. У поўнач, калі страляніна крыху сціхла, вялікая частка параненых пакінула эшалон і накіравалася ў незанятыя фашыстамі вёскі. Разам з імі пайшла асноўная частка медыцынскага персанала эшалона. Лена засталася з шасцю санітарамі абслугоўваць 130 цяжка параненых. Іх трэба было забяспечыць медыцынскай дапамогай і вынесці з варожага акружэння.

Доўгі нерухомы эшалон стаяў на чыгуначным шляху. Але ў зялёных вагонах цяплілася жыццё. Лена Жаваранкава бесперапынна хадзіла па саставу, рабіла перавязкі, падбадзёрвала параненых ласкавым словам, карміла, падавала ваду. Фашысты маглі ў любую мінуту напасці на эшалон. Кемлівая сястра арганізавала ахову поезда. Не зводзячы вачэй, цэлыя ночы вартавала сама.

ва бясстрашна перавязвала параненых, укладвала іх з дапамогаю сяброўак у машыны.

У разгар бою ў цемры Лена ўбачыла лейтэнанта з маленькай дзяўчынкай на руках. На падранай дзіцячай сарочцы чырванелі плямы засохлай крыві. Стрымліваючы слёзы, лейтэнант расказаў страшэнную быль. Праходзячы са сваёй часцю праз родную вёску, ён зайшоў наведаць сваю сям'ю. Але замест хаты ён убачыў руіны. Сярод іх лейтэнант знайшоў забітых жонку, сына і непрытомную маленькую дачку. Урачы і сёстры спынілі на міг работу,—так узрушыў іх расказ лейтэнанта.

Лейтэнант падаў сястры дзяўчынку, якая яшчэ не апрытомнела, і голасам, поўным рашучасці і помсты, сказаў:

— Клянуся табе, дачка мая, я адпомшчу праклятым звярам за тваю маці, брата і ўсіх забітых жанчын і дзяцей!

Словы лейтэнанта прагучэлі грознай клятвай і для Лены Жаваранкавай. Перамагаючы падступіўшыя да горла спазмы, глытаючы слёзы, яна дала сабе слова: чэсна і самаадданна працаваць на фронце. Сэрца яе напоўнілася кіпучай нянавісцю да фашысцкіх людаедаў.

З таго часу прайшло многа дзён, але ўспамін той страшнай ночы не пагас. Ён жывы, ён прымушае часцей біцца сэрца, мацней сціскаць рукі, ён паклаў на твар дваццацітрохгадовай дзяўчыны ледзь прыкметныя маршчынкі. Медыцынская сястра Жаваранкава цвёрда выконвае сваю клятву.

Дні на фронце ідуць грозныя і напружаныя. Разам з імі да сельскай акушоркі прышлі вопыт

і навык, рашучасць і ўменне дзейнічаць у любой абстаноўцы. Баявыя справы медсястры Лены Жаваранкавай сталі шырока вядомы.

Аб простай дзяўчыне ў шэрым шынялі з любоўю гавораць на фронце і ў тыле. Яе подзвіг служыць прыкладам для тысяч медыцынскіх работнікаў Дзеючай арміі. Аб ёй усхвалявана гаварыла ў сваім выступленні на жаночым антыфашысцкім мітынгу ў Маскве прыбыўшая з фронта медсястра тав. Сакалоўская.

Чым-жа праславілася Лена Жаваранкава?

У раёне горада Ярцава немцы высадзілі дэсант. Пад прыкрыццём ночы фашысцкія паганцы наблізіліся да палатна чыгункі і пачалі абстрэльваць яго з мінамётаў. Рух на чыгунцы быў спынены. Санітарны поезд з некалькімі сотнямі параненых, у якім ехала медсястра Жаваранкава, аказаўся адрэзаным.

Немцы былі зусім блізка. Яны занялі прыдарожны лес. У поўнач, калі страляніна крыху сціхла, вялікая частка параненых пакінула эшалон і накіравалася ў незанятыя фашыстамі вёскі. Разам з імі пайшла асноўная частка медыцынскага персанала эшалона. Лена засталася з шасцю санітарамі абслугоўваць 130 цяжка параненых. Іх трэба было забяспечыць медыцынскай дапамогай і вынесці з варожага акружэння.

Доўгі нерухомы эшалон стаяў на чыгуначным шляху. Але ў зялёных вагонах цяплілася жыццё. Лена Жаваранкава бесперапынна хадзіла па саставу, рабіла перавязкі, падбадзёрвала параненых ласкавым словам, карміла, падавала ваду. Фашысты маглі ў любую мінуту напасці на эшалон. Кемлівая сястра арганізавала ахову поезда. Не зводзячы вачэй, цэлыя ночы вартавала сама.

Праз тры дні ў эшалоне не засталося ні кавалка хлеба. Жаваранкава знайшла ў суседнім эшалоне вагон з мукой. На дапамогу ёй прыйшлі калгасніцы з суседняй вёскі. Яны прабраліся да вагонаў праз лес паўзком, прынеслі параненым байцам малако і ягады і з радасцю прынялі прапанову спячы хлеб і пірагі. Насыпаўшы ў навалачкі мукі, яны непрыкметна пайшлі, а рынымраненька прынеслі свежы белы хлеб і румяныя пірагі.

— Цяпер я прашу зварыць нам суп,—сказала Жаваранкава калгасніцам. Тыя ахвотна згадзіліся.

Вечарам да эшалона бясшумна пад'ехала сялянская падвода. Возчык, барадаты дужы дзед, ішоў уздоўж вагонаў і пытаў у сустрэчных:

— Дзе-б убачыць дзяўчыну, што ў шынялі?

З пасланцом калгаса Жаваранкава сустрэлася, як з жаданым госцем. Стары прывёз некалькі скрынак з макаронамі. На світанні ён з'явіўся каля эшалона зноў. На возе стаялі бідоны, напоўненыя гарачым малочным супам.

— Вось і зварылі,—гаварыў стары. —Ешце на здароўе, папраўляйцеся. Сваім мы рады дапамагчы ўсім, чым можам.

На зыходзе пятага дня да эшалону прышлі тры дружынніцы. Яны расказалі, што непадалёку знаходзіцца савецкі палявы шпіталь; дастаткова прарвацца праз варожае кальцо, і людзі будуць выратаваны. Медсястра Жаваранкава рашыла прыкласці ўсе намаганні і знайсці дарогу. Зрабіць гэта яна рашыла сама.

Параненыя і санітары не хацелі адпускаць сястру. Яна разумела, што рызыка была надзвычай вялікай. Санітар Іван Грушын гаварыў:

— Пайду я. Мяне ніводзін нямецкі сабака не ўбачыць. Я пралезу скрозь ігольнае вуха.

— Не, ісці трэба мне,—даводзіла Лена. —Я пераапрануся і прайду непрыкметна.

Апрануўшы сарафан, павязаўшы галаву касынкаю, комсамолка Жаваранкава раніцой пайшла ў дарогу. З ёю пайшла адна з супрацоўніц. Яны прабіраліся глухімі ляснымі сцежкамі, стараліся трымацца воддаль ад вялікіх дарог. У вёскі заходзілі толькі пераначаваць.

— Паблізу аднаго сяла,—расказвае Жаваранкава,—нас гукнула жанчына. Мы падышлі да яе. Яна была цяжка паранена і не магла падняцца з зямлі. Побач з ёю ў лужыне крыві ляжала яе параненая дачка. Мы аказалі ім дапамогу і хутка пайшлі далей. Не паспелі прайсці і пяці кілометраў, як з паветра на іх накінуўся фашысцкі сцярвятнік. Ён знізіўся і стаў абстрэльваць з кулямёта безабаронных жанчын. Жаваранкава і яе спадарожніца схаваліся ў кустах і сталі прабірацца далей лесам.

У лесе яны сустрэлі калону совецкіх аўтамашын, якая давезла іх да месца.

Неспакойнае сэрца б'ецца ў грудзях комсамолкі Лены Жаваранкавай. Не паспеўшы як належыць адпачыць, яна патрабавала неадкладна даць для перавозкі цяжка параненых аўтамашыны і адправілася разам з імі.

20 аўтамашын дзень і ноч глухімі дарогамі прабівалі сабе шлях да санітарнага эшалона. Не адзін раз вадзіцелям машыны даводзілася ўступаць у схваткі з ворагам, будаваць і рамантаваць масты. І ўсюды іх суправаджаў зычны, вясёлы голас дзяўчыны ў шынялі.

Рэйд медсястры Жаваранкавай быў удалым. Яна прывяла машыны да эшалона і вывезла ўсіх 130 параненых у глыбокі тыл.

Франтавое жыццё адкрыла перад сельскай акушоркай новыя далі. Комсамолка Лена Жаваранкава стала доблеснай гераіняй любімай бацькаўшчыны.

Пімен ПАНЧАНКА

## САША

Можна боль заглушыць і суцішыць вялікае
гора,
Можна жыць у разлуцы далёка ад родных
прастораў,
Аднаго не забыць, аднаго у душы
не закрэсліць,
Гэта нашу нянавісць, што скрозь бой мы
пранеслі.

Тут спалучана ўсё: ярасць грому і гнеў
бліскавіцы,
І найлепшыя мары, і сны, і празрыстасць
крыніцы.
Ты, нянавісць, трывожыш агнём незгасаючым
сэрца,
Ты Тышкевіча Сашу вядзеш на дарогу
бяссмерця.

Саша... жвавы хлапчук. Чатырнаццаць гадоў
адзвінела,
Чатырнаццаць садоў адцвіло,—тады зашугала
вайна.
Цераз родны парог уваходзіць у хату ён
смела,
Кліча маці, ды мёртвай ляжыць на падлозе
яна.

Любы бацька і брат і сястрычка штыкамі
заколаты,
Паламана калыска, на кнігах забойцаў сляды.
У такую хвіліну сівеюць ад жаху сады,
У такую хвіліну нядужы становіцца волатам.

Не крычаў і не енчыў, толькі вочы
заплюснуў,
Дзве гарачых слязінкі ўпалі на матчыны
вусны.
— Мама, мама, устань! — і павекі яна
расчыніла,
І на помсту страшэнную мёртвай рукой
благаславіла.

І пайшоў ён у Жлобін, рашучы і узмужалы,
Па знаёмай дарозе, размолатай танкамі ў пыл,
А кругом у красе дарагая радзіма ляжала,
Зелянела атава, залацелі пад сонцам снапы.

Ён стаяў на рагу, непрыкметны ля камяніцы,
І дзіцячыя чыстыя вочы глядзелі журботна
наўкол.
І не ведаў ніхто, што ў вачах гэтых бура
таіцца,
Што увесь ён напоен нянавісцю спаленых сёл.

Глуха скрыгалі танкі, грукаталі нямецкія боты.
Ён стаяў, ён чакаў, ён згараў у агні завірух.
Дзе-ж яны, дзе-ж забойцы? І выехаў з-за
павароту
Афіцэрскі аўтобус са зграяй кляймёных
падлюг.

Надыходзь-жа хутчэй, баявая святая
расплата!
Дваццаць крокаў, пятнаццаць... і помста
зрываецца з рук,

Банду псоў ашалелых ушчэнт спапяляе
гранатай
Мужны Саша, наш сокал, і падае мёртвым
на брук.

І стаялі над трупам героя немцы, тупыя
ад злосці,
Страх ледзяніў іх звярыную кроў:
«Калі дзеці совецкія гэтак бязлітасна
помсцяць,
Колькі-ж гневу тады і адвагі у іхніх
бацькоў?»

★

Пятрусь БРОЎКА

# ПАЭМА ПРА СМАЛЯЧКОВА



1

Ён горада Леніна воін, юнак, абаронца суровы,
З бароў беларускіх да славы й бяссмерця
прывёў яго шлях.

Прайдзіся-ж ты, сціплая песня па мужных
слядах Смалячкова,
Па снайперскіх тайных засадах, па плошчах
і шумных палях.

Прайшоў ён праз полымя боек у жоўтыя дні
лістапада,
Гадзінамі стыў на марозе, схаваны між гурб
снегавых,—
Налітае волавам неба вісела ля сцен
Ленінграда,
Ён паў, разганяючы хмары, бліснуўшы
маланкай між іх.

Да рускай зямлі прытуліўся, спавіты
паўночнай зарою,
Маўклівы, раскінуўшы рукі, пад ветрам зімы,
ледзяным,
Ды пільна ўглядаліся ў далеч юнацкія вочы
героя
Туды, дзе сябры комсамольцы ў баях
ўспаміналі аб ім.

За ім баявая сталіца, што грознаю вартаю
стала,
Там плошчы, дзе ў памяці дружай і сёння
ён ходзіць жывы,
Заводаў узнятыя трубы, гранітнай чаканкі
кварталы,
І рокаты фінскай затокі, і гордыя плыні Нявы.

— Ты спі, наш таварыш, спакойна! Атакі
сябрамі адбіты.
І вораг разбіты сканае. Яго затапіўшы
ў багну,
Імя тваё, Федзя, мы ўзнімем па вуліцах,
сонцам аблітых,

І ў родных палях Беларусі з бацькамі
сустрэнем вясну.

Мы пройдзем, на травах духмяных
абсыплюцца зорныя росы,
Загойдаюць ветры ласкава палёў залатыя
дары,
Мы пройдзем сцяжынкамі тымі, дзе
хлопчыкам бегаў ён босы,
Журботна схіліўшы галовы, аб ім нам
раскажуць бары.

Мы ўбачым народ, у якога узяў ён арліныя
крыллі,
Адкуль яго постаць асілка і зоркія вочы—
чаму,
Якая зямля ўзгадавала, якія крыніцы паілі,
Якія дубровы спявалі ваяцкую песню яму.

Пала досвіткам заранка,
Разагнала ночы сны.
Над ракою Трасіянкай
Расплыліся туманы.

І бяжыць, як бачыць вока,
Сінь, прабіўшы паплавы,—
Быццам кінуў хто далёка
Срэбны пояс між травы.

А кругом ракі—дарогі,
Дыванамі мурагі...
І вярба, абмыўшы ногі,
Ў даль праводзіць берагі.

Моўкнуць сонныя чароты,
За гарою ветры спяць,
І зямля яшчэ дрымоты
Не паспела адагнаць.

Сонца выбілася ледзьве
З-за вершаліны сасён...
Што-ж не спіш ты,
Хлопчык Федзя,
Ці табе не смачны сон?

Не, не можа спаць хлапчына
Гэтым ранкам залатым,
Ходзіць статак па лагчыне
Федзя мусіць быць пры ім.

Ён авечак гэтак пасвіць,—
Хоць на выстаўку бяры.
Смалячкова у калгасе
Нездарма завуць: «Стары».

Смалячкоў гаворыць з борам,
З серабраным ручаём,
На высокі, ўзыйдзе, ўзгорак,
Ды прыгледзіцца кругом...

Над пшаніцамі густымі
Пеніць песня цераз край,
Магілеўшчына, радзіма,
Беларускі родны край!

Колькі возераў люстраных
Захавана ў верасах,
Колькі казак нескапзаных
Разбрылося па лясах!

Колькі песень звонкіх, чыстых,
Узлятае на зары,
Колькі птушак галасістых
У зялёным гушчары!

А як свецяць ноччу зоры,
А які таемны гай.
Магілеўскія прасторы,
Беларускі родны край!

А дрымоты баравыя,
А усмешкі заранiц,
А вясёлкі дажджавыя,
Што красу бяруць з крыніц!

А агні са смольным дымам,
А раўнюткі — роўны шлях,
Магілеўшчына, радзіма,
Беларуская зямля!

А якія ветру шумы,
А як непагадзь гудзе!
І плывуць у Федзі думы,
Быццам крыгі па вадзе.

2

Нядаўна было гэта. Можа назад
Чатыры,
А можа і болей гадоў,—
Да бацькі ён часта прыходзіў у сад,
Садзіўся з ім разам і гутарку вёў.

І доўга між імі ішла ў шалашы
Гамонка.
Глядзелі і бацька і сын,
Як падаюць зорамі ў змрочнай цішы

Буйныя антоны з прыгнутых галін.
Як нікнуць дадолу чаромхі кусты,
Як моўкнуць
Птушынай сям'і галасы,
Як шэпчуцца ўпотай па дрэвах лісты,

Як травы нямеюць пад срэбрам расы,
Як месяц запальвае ў небе касцёр,
Пад ранак
Кідаючы толькі вятох...
Здавалася Федзю бязмежным жыццё,
Як мары, каторых злавіць ён не мог.

А побач праходзіў чыгуначны шлях,
Прарэзаўшы
Нівы, лясы, гарады...
Па ім нясупынна па начах і днях
З палёў Беларусі ішлі паязды.

І Федзя ў плячах уздымаўся і рос,
Прад ім
Адкрываўся нябачаны свет.
Ён слухаў сціхаючы грукат калёс,
Як быццам хацеў ім пабегчы услед.

Прайшло яшчэ некалькі летаў і зім.
Быў травень.
Асветлены кветкамі сад.
Сказаў Смалячкоў аднагодкам сваім:
— Я заўтра паеду, сябры, ў Ленінград.

Сябры сумавалі.
Пыталі не раз,
Згадаўшы аб рана мінуўшай вясне:
— Ты вернешся, Федзя? Прыедзеш да нас?
— А як-жа, вярнуся. Чакайце мяне!

3

Ленінград.
Смалячкова мы зналі
Па-вясковаму простым:
Бегаў босым па лузе хлапчанё-пастушок.

Ленінград!
Ты яго ўзгадаваў,
Ты узняў яго постаць,
Даў рашучасць жаданням, навастрыў яго
зрок.

Воды Фінскай затокі, вы яго захаплялі
Неспакойнай гамонкай,
Гулам песень сваіх,
Як любіў ён на ўзмор'і шторм, суровыя хвалі,
І глядзець, як лінкоры праплываюць між іх.

Як любіў ён свой горад.
І граніт камяніцаў,
І дзівосныя ўзоры мастака-разбяра,
Як любіў ён, калі бляск паўночнай зарніцы,
Падаў срэбным святлом над узлётам Пятра.

Як ён цешыўся там за сваё пакаленне,
За жыццё,
Што сюды юнака прывяло,
Чуў ён сэрцам—
Там жыў, працаваў мудры Ленін,
Там паветра, здавалася, гэтым жыло.

Славіў горад магутны,
Што ўздымаўся над светам,
І красу яго вуліц над Нявою—ракой,
Дзе стваралі бяссмерце мастакі і паэты
Для народа свайго неўміручай рукой.

Сэрца Леніна горад
Прывяло, паяднала
З родным краем яго. Федзя марыў не раз:
Падрасту,
Навучуся быць на ўсё дасканалым...
І, палі Беларусі, я прыеду да вас.

Быў чэрвень,
Калі ўсё расло і цвіло,
І дваццаць першага вечар спакойны,
А дваццаць другога сонца ўзышло
Пад грукат гарматаў крывава-чырвоным.

Як быццам з'іначыўся свет уначы,
Маўкліваю, летняй, начною парою,
І тыя, што клаліся мірна спачыць,—
Уранку
Ўставалі, трымаючы зброю.

І выбухі рвалі сасновую глуш,
Усюды
Стагнала, смылела, гудзела...
І кветкі злятаді з яблынь і груш,
Зямлю засцілаючы саванам белым.

Святочна-ўрачысты,
Паўсутак назад,
Пачуўшы разбойны напад чужаніцаў—
На захад сурова глядзеў Ленінград,
Гудзелі ад гневу кварталы сталіцы.

Ляцелі трывожныя весці—ганцы,
Радзіма
Склікала на бойку герояў,
І крочылі ў строях паходных байцы
Туды, дзе зямля чырванела крывёю.
І раніцай тою ў кругу дружбакоў,
Як сын, што радзіме душою аддаңы,
Ў райком комсамола прыйшоў Смалячкоў:

— Таварышы!
Сэрца баліць несціхана.

Пара мне!
У бойцы адзіны мой шлях,
Неважна, што к часу не вышаў гадамі.
Мяне беларуская кліча зямля,
І бацька гукае з малымі братамі.

Сягоння пажары і выбухі там,
Крывёй
І слязамі там поўны крыніцы...
Я кляўся ў дзяцінстве дубровам, гаям,
Што з першымі буду ў часы навальніцы.

Збыліся жаданні і мараў і дум,
Бо роўна праз тыдзень ў ваяцкім уздыме—
У горадзе Леніна,
Ў летнім саду
Байцы прысягалі і Федзя між імі.

5

Снежань. Студзень. Снягі. Кулі сыпалі
градам.
Маразы праціналі аж да самай душы.
Вораг лёг, як удаў
Навакол Ленінграда,
Сыпаў джалам зміяным, нас хацеў задушыць.
Гнеў насілі танкісты, маракі, пехацінцы,
Што-ж на роднай зямлі закаваным сядзець?
Шмат крывавых дарог
Аблягала сталіцу,
Людзі знаді адно—ці прарвацца, ці смерць.

Не прайсці чужаземцам! Моцна сіла
ў народзе,
Ёй дзяды надзялілі храбрых ўнукаў здавён.
Смалячкоў кожны дзень
Ледзве золак—выходзіць,
І за краем пярэднім сочыць ворага ён.

Хай злуецца мароз, хай мятлюга шугае,
Ды нічога за помсту няма гарачэй,—
Федзя ляжа ў кусты,
І ніхто не пазнае,
Што адтуль назірае пара зоркіх вачэй.

Бачыць ён — немчура ўглыб залезла кратамі,
Блізка, блізка яны, што прынеслі разбой,
І здаецца яму,
Бачыць ён за дратамі
Родны край-Беларусь, край, спавіты журбой.

Бачыць—бацька з братамі, апусціўшы галовы,
Адыходзяць у пушчы, пакідаючы дом,
І раку Трасянку,
І лясы, і дубровы,
І бярозу, што плача над хмурым вакном.

Бачыць віселні там, дзе калісьці збіраўся,
Будаваць па прыездзе вялізны завод,
Бачыць — плача дзяўчына.
Ёй калісьці баяўся
Расказаць, што кахае з чатырнаццаці год.

Бачыць—ходзяць сябры па лясах Беларусі,
Крыкнуць хочацца ім: «Хлопцы! Разам
нам жыць!
Пачакайце мяне,
Я-ж казаў, што вярнуся.
Хто нас можа навек разлучыць, падзяліць?

Будзе радасць у нас, маці стрэнецца з сынам,
Можа ў жоўтую восень, ці зялёнай вясной,
А паду і не ўстану,
Знайце—я не загінуў,
Я прабіў сабе шлях да радзімы сваёй.

А над полем вайны вецер, снег і марозы,
Усё жывое ў зямлю закапала зіма...
...Паказалася постаць
Над акопам варожым,
Прамільгнула секунда і яе ўжо няма.

Паляваў на ваўкоў я, а цяпер на фашыстаў,
Шкода толькі, што знішчыў паганцаў
не шмат.
—Сёння соты!—
Сказаў Смалячкоў урачыста.
Вось табе за пакуты, за мой Ленінград.

Там, на вуліцах змрочных плачуць дзеці
напэўна,
Там ад свастыкі вашай шмат няма ўжо
ў жывых.
Што патрэбна табе,
Валацуга з-пад Рэйна,
Што цябе прывяло да ўзбярэжжаў Нявы?

Вам ляжаць між раўнін, як ламаччу і хламу.
На пустых чэрапах парасце дзікі мох.
Хто вас клікаў сюды,
Махляры і прыблуды,
Вам адгэтуль вярнуцца не будзе дарог!

Так вядзе ён падлік. Ноч пачне апускацца,
Ляжа крыллем пахмурым на снягі,
між кустоў.
Морак дол засцілае.
Смалячкоў у зямлянцы,
Справе снайперскай ён навучае байцоў,—
Як прабрацца да мэты непрыкметна, употай,
Як страляць, каб без промаху весці агонь.
І ў каго не спытай з Ленінградскага фронта—
Кожны скажа аб славе ваяцкай яго.

6

Непакояцца ва ўзводзе,
Толькі й знаюць у бяседзе.
Дзень мінае. Ноч праходзіць,—
Што-ж няма так доўга Федзі?

Камандзір, ў баях суровы,
Хваляваўся вельмі рэдка,
Усё-ж двух вучняў Смалячкова
Пасылае на разведку.

За сваім пярэднім краем
Папаўзлі яны праведаць,
Ноч у пошуках блукаюць,—
Не відаць нідзе і следу.

Да бяроз прыпалі ўпрыцем:
— Ці не бачылі вы мoжа?
Беластволыя, скажыце?
Ды стаяць маўчаць бярозы.

— Вы, сняжынкі, з белым крыллем,
Што над фронтам праляцелі,—
Можа вы яго накрылі?
І ў адказ снягі цямнелі.

— Стой, вятры, вам ведаць болей,
Мо' таварыша спаткалі?
Ці ў кустах, ці ў чыстым полі?
Ветры-ж толькі застагналі.

А назаўтра раніцою
Анямелі, адшукаўшы,—
На прыгорку, пад сасною,
Ён заснуў, снягі абняўшы.

Апаліла сэрца жалем
Па герою маладому,—
Перад ім шляхі ляжалі,
Што вялі яго дадому.

І здавалася, што ў полі
Ён сяброўскі голас чуе,
А яны сказалі з болем:
— Смалячкоў! Мы не даруем!

Хай сягоння нам журботна,
Абяцаць табе мы можам—
Ты забіў іх болей сотні,
Федзя, гэты лік памножым.

Не забудзецца краіна
Сына з бацькаўскіх загонаў,
Па тваіх слядах, пуцінах
Вучняў выйдзе незлічона!

---

Ты, смерць, паміж намі і храбрым ніколі
не ляжаш мяжою,
Мы змоўчым ад болю і ў грудзях задушым
пакутлівы стогн.
Не плакаць нам дадзены слёзы, жалобнаю
чыстай слязою
Мы клятву прыносім герою, што будзем
змагацца, як ён.

А клятву такую, што знішчым, што набрыдзь
чужынцаў раструшчым,
Трымаючы сцягі гвардзейцаў заўсёды
высока ўгары,
Шумяць ленінградскія плошчы, гудзяць
беларускія пушчы,
Упарта з баямі на захад ідуць смалячковы
сябры.

І пройдуць, на травах духмяных абсыплюцца
зорныя росы,
Загойдаюць ветры ласкава палёў залатыя
дары,
І пройдуць сцяжынкамі тымі, дзе хлопчыкам
бегаў ён босы,
Журботна схіліўшы галовы, пра Федзю
раскажуць бары.

Сустрэнуць народ, у якога ўзяў ён арліныя
крыллі,
Пазнаюць—чаму ён асілак і зоркія вочы—
чаму,
Якая зямля ўзгадавала, якія крыніцы паілі,
Якія дубровы спявалі ваяцкую песню яму.





М. ЦВЯРСКОЙ

## ТРЫНАЦЦАЦЬ

У глухіх клічаўскіх лясах сышліся трынаццаць комсамольцаў, гатовых да суровых баёў, да жыцця, поўнага небяспекі і нягодаў. Яны спалі на сырой зямлі, і сон іх быў кароткім. Яны елі разам з аднаго кацялка, які захапіў з сабою башкір Хамат Фалетаў, уцякаючы з нямецкага палону. Яны з аднолькавай ярасцю білі ворага, бо ў кожнага з іх былі свае разлікі з немцамі, а ва ўсіх — агульны вялікі рахунак.

Якаў, пасылаючы ў немца кулю, гаварыў:

— Гэта за маю маці.

А Хамат, падпаўзаючы ў цемры да нямецкага вартавога і ўсаджваючы яму ў горла востры башкірскі нож, шаптаў:

— Помніш, падлюга, майго брата? Помніш, як ты паліў яго цела агнём?

— Усе вы звяры, — гаварыў ён, — усіх вас трэба рэзаць.

Ніхто ў атрадзе лепш не ўмеў падкрасціся да немцаў, пранікнуць у штаб, зняць варту, падпаліць склады. Хамат быў выдатным разведчыкам, вачыма і вушамі атрада.

Шмат разоў наляталі партызаны на немцаў. І заўсёды гэта было нечаканасцю для ворага. Эсэсаўцы, паліцэйскія, карныя атрады не маглі справіцца з няўлоўнымі партызанамі. Здаралася, што хлопцы траплялі ў акружэнне. Немцы ўжо загадзя святкавалі перамогу, але раптам дзесьці з боку або ззаду раздавалася кулямётная чарга, і гітлераўцы, пакідаючы забітых, пачыналі ўцякаць.

Так было ў вёсцы В., калі 300 эсэсаўцаў акружылі маладых партызан і занялі ўсе выхады з вёскі. Але камандзір групы, смелы і вынаходлівы партызан Барада і на гэты раз ашукаў немцаў. Камандзір завязаў бой з фашыстамі, а Якаў з астатнімі байцамі пранік у тыл ворага і ўдарыў па немцах з усіх кулямётаў. Удар быў настолькі нечаканым і моцным, што эсэсаўцы, страціўшы забітымі 50 чалавек, пакінуўшы кулямёт і 10 аўтаматаў, адкаціліся ад ускраіны вёскі. Кальцо было разарвана і партызаны вырваліся з акружэння.

У часе гэтага бою Барада быў акружаны групай нямецкіх аўтаматчыкаў. Іх было каля трыццаці. Але камандзір не разгубіўся. Ён прысланіўся да сцяны аднаго хлява і расстрэльваў немцаў з аўтамата. Ён падпускаў фрыцаў на блізкую адлегласць і трапна klaў іх назаўсёды на зямлю. Куля прабіла яму левую руку, як каля яго ўжо ляжала 13 забітых ім немцаў. Калі ён быў паранены ў другі раз, немцы кінуліся, каб захапіць яго ў палон. Але тут адважны партызан разануў па іх доўгай чаргой з аўтамата. Уся група немцаў была знішчана.

Слава аб бясстрашных партызанах хадзіла па ўсім раёне. Насельніцтва бачыла ў іх сваіх кроўных братоў, сваіх абаронцаў. І калі ў вёсцы З. адной-

чы раніцай з'явіўся карны атрад і пачаў свой дзікі разбой, у лес да партызан з'явіўся 70 гадовы Іван Гаўрылавіч і папрасіў дапамогі.

— Ратуйце, родныя, — прасіў дзед, — нашых людзей гоняць на катаргу. Маладыя партызаны былі напагатове. Але як дапамагчы? Немцаў было ў шмат разоў болей. Камандзір даручыў 13 комсамольцам на чале з Якавым наладзіць на дарозе засаду. Уночы Хамат пайшоў у вёску. Яму было загадана даведацца колькі там немцаў і калі яны павязуць людзей на станцыю. Хамат устанавіў, што дзяўчат павязуць на трох машынах. На астатніх двух грузавіках паедуць немцы. Якаў хутка прыняў рашэнне. Ён загадаў падпілаваць дрэвы, якія стаяць на абочыне дарогі, і як толькі пад'едуць машыны, зваліць гэтыя дрэвы. Так і было зроблена. Машыны, наскочыўшы на нечакана паваленыя дрэвы, спыніліся. Не паспелі немцы хапіцца за зброю, як з лесу грымнулі залпы. Партызанскі агонь абрушыўся на фашыстаў. Дзяўчаты былі вызвалены.

Пасля гэтага раз'юшанае нямецкае камандаванне кінула супроць партызан батальён салдат і авіяцыю. Тады Якаў прапанаваў пакінуць на заслон комсамольцаў, а астатнім выйсці з акружэння. Барада ўважліва выслухаў Якава і згадзіўся з ім. Уночы атрад зняўся з месца і, развітаўшыся з комсамольцамі, пакінуў стаянку.

Надышла раніца. Сонца, узняўшыся з-за дрэў, асвяціла жменьку храбрацоў, якія рашыліся прыняць бой з батальёнам нямецкай пяхоты. На невялікім лясным масіве 13 комсамольцаў акапаліся і падрыхтаваліся да сустрэчы з ворагам. Яны ведалі, што гэта будзе іх апошні рашучы бой, што многія з іх ужо не ўбачаць другое раніцы. Васіль ляжаў каля свайго кулямёта і глядзеў, як

хлопцы рыхтаваліся да бою. Хамат паклаў каля сябе некалькі дыскаў для аўтамата, пару гранат і ўваткнуў у зямлю перад сабой свой башкірскі нож. Браты Рыгор і Уладзімір абклалі сябе гранатамі і дыскамі.

На заходнім участку абароны знаходзіліся Васіль, Мікалай, Рыгор, Міхась і Іван. Яны абаранялі ўваход у лес з боку невялікай рачулкі. Усходні сектар займалі Якаў, браты Рыгор і Уладзімір, Хамат і Міша. Яны трымалі пад абстрэлам адкрытае поле, адкуль немцы збіраліся весці наступленне галоўнымі сіламі. Васіль К., Уладзімір і Вася падаліся з кулямётам наперад. Немцы замкнулі кальцо. Наступаць яны не спяшаліся, бо ведалі, што іх больш чым партызан у некалькі разоў.

Раніца была яснай і ціхай. Жоўты ліст ціха шуршаў пад нагамі. Дрэвы стаялі спакойнымі і нерухомымі.

— Як прыгожа, — сказаў у задуме Васіль.

У 12 гадзін дня ў паветры прасвістаў першы снарад і разарваўся ў размяшчэнні групы Васіля.

— Пачынаецца, — прамовіў Іван і паглядзеў на сяброў.

Калі, атакуючы у лоб, гітлераўцы наблізіліся за 200 метраў, Васіль адкрыў кулямётны агонь і прымусіў іх залегчы. 27 акупантаў леглі, каб ніколі больш не падняцца. У гэты-ж час рота немцаў імкнулася абыйсці партызан з тылу, але наткнуліся на моцны кулямётны агонь Васіля і Міхася. Пакінуўшы два дзесяткі забітых, немцы адкаціліся назад, не змогшы вярнуцца ў лес.

Тры разы яны спрабавалі ўвайсці ў лес, але трапны кулямётны агонь валіў іх на зямлю і яны вярталіся назад.

Надвячоркам немцы, не дабіўшыся поспеху, адкрылі па лесе ўраганны кулямётны агонь. Гадзін чатыры міны крамсалі дрэвы, ірвалі на шматкі зямлю. Камсамольцы ўрыліся ў зямлю і ляжалі нерухома. Але вось міна разарвалася ля пярэдняга кулямёта, разнясла яго ўшчэнт і асколкам забіла Васю. Гэта была першая страта камсамольцаў. Услед за гэтым быў цяжка паранены Васіль, а Рыгору прабіла руку. Надыходзіла ноч.

— Нашы ўжо даўно адышлі, — сказаў Мікалай, — трэба адыходзіць і нам.

Хамат пайшоў у разведку і, вярнуўшыся, паведаміў, што ўсе праходы закрыты.

Надосвітку немцы перайшлі ў наступленне з усіх бакоў. Вырвацца з варожага кальца ўжо не было ніякай надзеі. І камсамольцы далі клятву памерці, але жывымі ў рукі не дацца.

Бой кіпеў. Кальцо ўсё сціскалася, але падыйсці да камсамольцаў немцам не ўдалося. Іх касіў трапны партызанскі агонь. Тады немцы выклікалі авіяцыю. Над лесам з'явілася тройка «Юнкерсаў». Асколкамі бомб былі забіты Якаў і Васіль. Камандаванне прыняў Міхась.

З зямлі падняліся Хамат і Валодзя, Мікалай і Васіль З. З штыкамі яны кінуліся на немцаў і пачалі іх калоць. Упаў адзін, другі, трэці гітлеравец. Здавалася, ярасці партызан не будзе канца.

У Хамата зламаўся штык. Ён кінуў вінтоўку і ўзяўся за нож. Хамат кідаўся з боку ў бок, а нож у яго руках зіхацеў як маланка. Тады адзін з афіцэраў выстраліў у башкіра, і Хамат упаў з прабітымі грудзьмі. Ён імкнуўся яшчэ ўзняцца, каб дацягнуцца нажом да афіцэра. Але сіл не хапала, хоць ён яшчэ і жыў. І калі афіцэр нагнуўся над Хаматам, ён апошнім намаганнем волі схапіў

яго за руку, зваліў на зямлю і ўпіўся зубамі ў яго горла...

Уладзімір, Мікола і Васіль З. яшчэ змагаліся. Яны адбіваліся ад немцаў прыкладамі. Міхась ляжаў з прабітай галавою. Заліваючы крывёю жоўтую траву, паваліўся Мікалай. Застаўся адзін Уладзімір. Ён стаяў ля дрэва з апошняй гранатай у руках, і немцы баяліся да яго падыйсці.

— Гэта ёсць наш астатні і рашаючы бой! — заспяваў ён, і акрываўлены пайшоў на немцаў. І немцы не вытрымалі. Іх збянтэжыла храбрасць і мужнасць гэтага юнака. І яны кінуліся ўцякаць. Ён нагнаў салдат, урэзаўся ў самую сярэдзіну і кінуў гранату. Так загінуў самы малады з трынаццаці.



Кандрат КРАПІВА

## РАЗВІТАННЕ СЫНА

Не сумуй па мне, старая,
Будзь здарова, маці!
Вораг край наш разбурае —
Ці-ж сядзець мне ў хаце?
Ці-ж на тое палівала
Ты зямліцу потам,
Каб яна цяпер стагнала
Пад фашысцкім ботам?
Ці-ж на тое мне пра волю
Пела над калыскай,
Каб марнела наша доля
Пад пятой фашысцкай?
Лепш свабодным легчы ў полі
Ад варожай кулі,
Чым аддаць сябе ў няволю
І цябе, матуля.
Бараніць пайду свабоду,
Біцца з гадам лютым,
Што нясе майму народу
Здзекі ды пакуты.
Будзем жывы — будзем рады
Лёсу маладому,
А пакуль не знішчым гадаў
Не чакай дадому.

★

Максім ТАНК

## ГАСТЭЛА

Ты ляцеў над краінай бацькоў:
Пасівеўшыя замкаў вежы,
Стрэхі хат, даль блакітных палёў,
І як жнеі—бярозы на межах.

Самалёт быццам чайка — зарой
Пранасіўся над хвалямі жыта,
Будзіў нетры плужанскіх бароў,
Легендарнае возера Світазь.

І нішто не казала аб тым
У гэты дзень і спакойны і ясны,
Што засцеле зямлю гэту дым,
Што ў крыві хутка сонца пагасне;

Што прыдзецца табе, капітан,
Скрыжаваць з лютым ворагам зброю,
Што краіна бацькоў можа стаць
Хутка помнікам славы герою.

Нарастаючы гул над зямлёй.
Зорка сочым за кожным палётам:
Можа над паласой франтавой
Крыллі ўбачым твайго самалёта?

Не відаць... Толькі яркім агнём
Небасхіл азарыўся пагасшы,
І на захад звяно за звяном
Пралятаюць знішчальнікі нашы.

Прылятаюць яны штурмаваць,
Зніштажаць лютых ворагаў смела,
І ў агні, ў кожнай бітве шукаць
Самалёт капітана Гастэла.

## НЕ ШКАДУЙЦЕ, ХЛОПЦЫ, ПОРАХУ!

Не шкадуйце, хлопцы, пораху,
Куль гарачых і гранатаў.
Каму воля наша дорага,
Падымайцеся на ворагаў,
На катаў!

Пушчы змрочныя, высокія,
Недаступныя паляны,
Станьце могільнікам ворагу,
Будзьце схованкам для сокалаў —
Партызанаў.

Век жывым звяр'ю не вырвацца
І ад помсты не схавацца.
Нашы сілы растуць, шырацца:
Над Дняпром стаім, над Прыпяццю
На варце.

Днём — мы, як вятры крылатыя,
Быццам цень праходзім ноччу,
Сонным лагерам між хатамі,
Зніштажаючы гранатамі
Банду воўчу.

Чуюць гады ў кожным шораху,
Што ўжо блізіцца расплата.
Хай дрыжаць, пачуўшы ворагі
Песню: —Не шкадуйце пораху
На катаў!

★

Аркадзь КУЛЯШОЎ

## БАЛАДА АБ ЧАТЫРОХ ЗАЛОЖНІКАХ

Іх вядуць па жытняй сцяжынцы
Чатырох
Пад канвоем.
З дому.
Чатырнаццаць— старэйшай дзяўчынцы,
Тры гады — хлапчуку малому.
Разам з імі ў падвал халодны
Гоняць цётку — сястру Міная,
А Мінай — гэта бацька іх родны,
Бацька родны,
Мсціўца народны.
Пішуць немцы аб ім у газетах,
Аб чырвонай брыгадзе ягонай.
Па усіх
Былых сельсоветах
Клеяць новы
Загад суровы.
Са слупоў, са сцён, вакяніцаў
Пагражаюць Мінаю загадам:
Ён павінен скарыцца,
З'явіцца,
Здацца ў рукі нямецкім уладам.
І вісіць той загад друкаваны
На мінаевай хаце і клеці:
А не з'явіцца — расстраляны
Будуць заўтра заложнікі—

Дзеці.
У чаканні смяротнага часу
У падвале дзеці Міная,
З імі цётка іх родная разам—
Ёй таксама расстрэл пагражае.
— А чаму нас вартуюць салдаты?—
Знаць маленькаму хлопчыку трэба.
— А чаму не пускаюць за краты,
За якімі і сонца і неба?
— А ці скора нас вызваліць татка?
— Скора, — цётка гаворыць малому,—
Татка прыдзе і ўсім нам, дзіцятка,
Волю дасць—
І мы пойдзем дадому...
— А чаму не прыходзіць ён?
Сыну
Цяжка ўсё растлумачыць адразу.
— Спі, засні,—суцяшае жанчына
У чаканні смяротнага часу.
Цётка дзецям, уклаўшы малога,
Кажа праўду пра лёс іх суровы,
Не павінен ведаць нічога
Толькі меншы — сын трохгадовы.
Вы нічога яму не кажыце,—
Навучае
Дзяцей Міная.
Сын у сне гаворыць аб жыцце,
Па якому
Пойдзе дадому.
У вастрожнай
Трывожнай
Цішы
Сняцца краты меншаму сыну:
— Тут і мокрыя сцены
І мышы...
Татка, татка... забыў нас... пакінуў.

— Спі, засні,—суцяшае кабета,—
Спі, сынок, не твая гэта справа,
Спі, наш татка не прыдзе,
На гэта
Ён не мае бацькоўскага права.
Ноч праходзіць,
Сонца ўзыходзіць,
Заспявалі жаўранкі ў полі.
Іх выводзяць салдаты
За краты,
Хлопчык рад і сонцу і волі.
Іх салдат да сцяны прыстаўляе.
Цэліць кат у льняныя галовы,
Пачынае
З сына Міная.
Стрэл.
Упаў хлапчук трохгадовы...
Кат ізноў пісталет узнімае,
— На сцяне — заложнікаў цені.
Вось і ўсё.

. . . . . . . . . . . . . . . .

Перад бацькам Мінаем
Станьце, ўсе бацькі, на калені!
Не з'явіўся ён па загаду,
Не прасіў для дзяцей сваіх волі,
Не выпрошваў ім сонца за здраду
І выпрошваць не будзе ніколі.
Пасівеў ён, гавораць людзі—
Жыхары партызанскага краю.
Доўга помсціцца вырадкам будзем
За дзяцей партызана Міная.
Нашы танкі выціснуць дату
На іх касках і спінах паганых,
Нашы шаблі дапішуць баладу
Аб заложніках расстраляных.

★



Міхась ЛЫНЬКОЎ

# ЗНІШЧАЛЬНІКІ ЭШАЛОНАЎ

Лес. Ноч.

Ледзь прыкметная сцежка загубілася паміж дрэў, завілістай ніткай цягнецца ад паляны да паляны, перасякае заросшыя лясныя дарогі, і знікае ў непралазным гушчарніку, у дубняковым параснiку. Прыбярэжныя кручы. Ціха гудуць баравыя сосны, шапочуць аб нечым бярозы, асіны. Высокія елкі ўпіраюцца вострымі вяршынамі аж у самае неба. Калі вырываецца з кудзелістых хмарак светлавокі месяц, тады ўсё навакол робіцца бледным, зманлівым. Ні то звер, ні то нейкая пачвара прытаілася на дарозе, вось, вось кінецца на цябе, заляскоча зубамі, але-ж гэта толькі корч, звычайны корч ад струхлелай бярозы. Празрыстыя цені плывуць над палямі. Чуюцца шолахі, шорхат упаўшай галінкі, мяккі посвіст крылляў начной птушкі. Дзесьці на ўзлеску закугукала сава, і адразу цямнее лес, знікаюць цені, неба робіцца глыбокім, бяздонным. То схаваўся месяц за хмары.

— Ну, то пойдзем, хлопцы!

Людзі ўзнімаюцца з зямлі пасля кароткага адпачынку. Адзін за другім ідуць у начную цемень,

прадзіраюцца праз густы хваёвы параснік, абыходзяць краем поля, на якім стаіць, не шалахнецца, набраклае расою жыта. І зноў лес. Паляны. Пералескі. Кусты. Алешнікавыя парасnікі. Твалісты бераг балацянае рачулкі, гнуткая кладка. Прагна напіліся проста з берага, набіраючы цёмную ваду ў сцятыя прыгаршчы. Вада цурчыць, пераліваецца звонкімі кроплямі, упадае ў ціхую рэчку. Як добра напіцца пасля доўгай дарогі. Пасля гэтага не шкодзіла-б і падсілкавацца. Рукі нерашуча цягнуцца да мяшкоў. Але зноў каманда.

— Далей, далей, хлопцы, да відна яшчэ далёка...

Нясцерпна ныюць навярэджаныя ногі. Муляюць мяшкі на спіне. Абрываюць плечы прыкрыя лямкі. Ные рука пад вінтоўкай. А сцежка ідзе і ідзе, без канца і без краю. Навакол — ні агеньчыка, ні гуку, нібы вымерла ўсё, пазнікала. Не цепляцца прыветныя вогнішчы начлежнікаў, не чуваць балабанаў. Цёмныя шыбкі вясковых хатак, што прамігнулі з-за дрэў, холадна падміргнулі трапяткім святлом месячыка і засталіся на ўскрайку леса, нібы чужыя, забытыя. Толькі з глыбокага неба, відаць, з-за самых хмар, даносіцца ледзь чутнае прарыўчатае гудзенне. Дзесьці ідзе самалёт.

— Куды ён ляціць, пракляты?

Вось-бы прыкмеціць яго ды дагнаць гарачаю куляй, каб у самае сэрца трапіла яна ворагу.

Вінтоўкі сціскаюцца мацней у руках. Не такая ўжо цяжкая вінтоўка ў руцэ. Добра, калі ў руках вінтоўка. Ісці з ёй смялей, ісці весялей. Непрыкметна двое, што замыкаюць невялічкую калону з 9 чалавек, пачынаюць мурлыкаць ціхую песню. Добра і не дабярэш да ладу, што гэта за песня. Але з ёй лягчэй ступаць, не так хіліць да сну,

не так думаецца пра яду. Але пярэдні, які ідзе з аўтаматам і прагна ўглядаецца ў густую цемень ночы, у паўголаса падае каманду:

— Песню адставіць! Быць напагатове!

Уперадзе расступіўся лес. Ціха гудуць тэлеграфныя правады. Справа цямнеюць некалькі будынкаў, мігціць зялёнае вока семафора. Раз'езд. Трэба пераправіцца праз насып. Дзесьці ў баку чуваць прыглушаныя галасы,—відаць, нямецкія патрулі сышліся, абменьваюцца парай другой слоў. Людзі адзін за другім перапаўзаюць чыгунку, спускаюцца пад адкос. Задні зачапіўся вінтоўкай за штабель старых рэек і яны зазвінелі, будзячы начную цішыню. Ад чыгуначнага мосціка, што непадалёчку, спуджана затахкаў кулямёт.

— Лажыся!

Усе прыніклі да зямлі і глядзяць, як рознакалёрная стрэлка, — зялёная, чырвоная, сіняя, — прашыла начную цемру. Спачатку ў адным напрамку, потым у другім, у трэцім. Немцы б'юць трасіруючымі кулямі, б'юць — абы біць. Б'юць для страху і ад страху. Навакол лес. А там, дзе лес, там абавязкова павінны быць і партызаны.

— Айда далей!

Дзевяць чалавек, не спяшаючыся, ідуць далей. Пачынае святлець неба на ўсходзе. Напрактыкаванае вока ўжо можа адрозніць у цемры спіны таварышаў, уёмістыя мяшкі за плячыма. Хутка дзень. Зліпаюцца ад стомы вочы, нават рукі здаюцца непамерна цяжкімі, ледзь пераступаюць натруджаныя ногі. Але адпачываць яшчэ рана. Трэба завідна перабрацца цераз раку. Яна вырасла ўперадзе—цёмная, шырокая, незнаёмая. Сінія космы тумана плывуць над ёй, — тумана халоднага, пранізваючага. Навакол — ні чаўна, ні плыта. Людзі мераюць жэрдкай дно ля берага.

глыбока. Ўброд не пяройдзеш. Можна пераплыць, але як-жа быць з адзежай, з мяшкамі? Хутка збіраюць усякае ламачча, сухатравіну, пару бярвенняў, занесеных паводкай у лес. Трое, распрануўшыся, майструюць невялічкі плыт, звязваюць яго папругамі, тэлефонным дротам. Тыя, што на беразе, ляскаюць зубамі ад перадранішняе золі. Тыя, што ў вадзе, прыемна пакрэхтваюць. Вада цёплая, цяплейшая за паветра. Голыя, мокрыя целы курацца парай.

— Гатова!

Акуратна грузяць мяшкі, адзежу, вінтоўкі. Паёжваючыся, забіраюцца ў ваду, з адчаем акунаюцца з галавой. Тады цяплей. Старанна заграбаюць рукамі, трымаюцца блізка адзін другога. Плыт крыху адцягвае ў бок, але дзевяць пар рук моцна заграбаюць ваду і вось ужо ногі дакранаюцца дна, блізка бераг.

Калі выбраліся на сухое, зусім пасвятлела. Пачалі ружавець вяршыні соснаў. Хутка апрануліся, і, разабраўшы рэчы, падаліся ў непралазны хваёвы гушчар. Забраўшыся ў самыя нетры, зрабілі прывал. Нагледзелі добрае месца. Наваколе—ні дарог, ні сцяжынак. Атайбаваліся ля вялізнага вывaратня на пяшчаным узгорку. Расклалі невялічкае вогнішча. Сухое ламачча гарыць ярка, без дыму. Прыемна пагрэцца ля вогнішча, пачуць, як закіпае вада ў кацялках. Хлопцы сцягваюць пад вывaрацень дробны хворaст, яловыя лапкі. Пасцілаюць пару плашч-палатак. Як прыемна выпрастаць стомленыя ногі на гэтым мяккім ложку, які пахне брусьнічнікам, хвояй. Над табой ранішняе светлае неба. Залацяцца вяршыні дрэваў. З галінкі на галінку, бліжэй да сонца, пераскочыла вавёрка, старанна праціраe пярэднімі лапамі сваю пацешную пысу, робіць ранішні туалет. Яе

пышны хвост гарыць, палымнее пад сонцам. Спаць, спаць... Толькі двое вартавых старанна ўглядаюцца па баках, прыглядаюцца да дрэваў, асцярожна прабіраюцца воддаль месца адпачынку. Ды Максім—камандзір ускарабкаўся на высозную хвою, старанна аглядае мясцовасць. Калі ісці проста, лес хутка скончыцца, пачнецца поле. Лявей курацца дымкі ў хатах вялікага сяла. Правей балота, лазнякі. Балота цягнецца далёка, далёка, як толькі акінуць вокам. Прыдзецца ісці балотам далей. Максім злазіць з дрэва, яшчэ раз дае наказ вартавым і, паклаўшы пад бок аўтамат, кладзецца спаць і сам.

Сонца ўзнімаецца на паўдуба, лезе вышэй. Яно ўжо прыпякае над самымі галовамі. Спяць хлопцы. Толькі змяняюцца вартавыя, зорка сцерагуць сон таварышоў.

Ноч выдалася цяжкая. Балота цягнулася бясконца. Цярусіў дробны дождж, прамачыў усіх да апошняй ніткі. Ногі грузлі ў густой хлюпаючай гразі, спатыкаліся аб слізкія купіны. Сёйтой пачаў прыставаць і ўся калона пайшла паволі, каб не разгубіцца. Шэрая дажджлівая раніца заспела зноў на балоце. Не было месца для прывалу, і хлопцы зрабілі толькі кароткі прыпынак, выбраўшы крыху сушэйшае месца, на якім чарнелася мокрае хварасцё сцяжарні. Ішлі ўвесь дзень, тулячыся пад мокрым алешнікам. Толькі калі выбраліся на ўскрай вялікага густога бору, дождж перасціх і ў вячэрнім небе праступілі першыя зоры.

— Прывалу рабіць не будзем! Яшчэ кіламетраў сем і мы будзем на месцы...

Зусім прысталі хлопцы, змарыліся. Але разам страпянуліся, калі ўперадзе суха шчоўкнуў затвор вінтоўкі і нейчы голас паціху, але пагроз-

на загадаў ім спыніцца. То быў партызанскі дазор. А праз колькі хвілін хлопцы грэліся ўжо ў партызанскіх шалашах, пераапраналіся ў сухую вопратку, сушылі паходную сваю гаспадарку. У лагеры партызанскага атрада дзевяць падрыўнікоў наладзілі сваю базу, паставілі шалашы з яловай кары. Дні са два адпачывалі пасля доўгай і цяжкай дарогі, потым узяліся за працу. Некалькі дзён назіралі за чыгункай, якая праходзіла кіламетрах у сямі ад лагера. Добра вывучылі рух цягнікоў, прыгледзеліся да ўзброеных нямецкіх пастоў, устанавілі час змены караулаў, часы патрульных абходаў.

І вось вышлі на першую баявую аперацыю. Частка хлопцаў засталася ў засадзе, непадалёку ад чыгункі, трое папаўзлі на палатно, паставілі міну. Яшчэ і яшчэ раз праверылі ўзрывацель і, пераканаўшыся, што ўсё зроблена як след, хутка пакінулі палатно і далучыліся да таварышаў.

Якімі маруднымі, доўгімі паказаліся хвіліны чакання цягніка. Ледзь не ўскрыкнулі ад радасці, калі здалёк пачуліся першыя гукі паравоза. Адышліся крыху далей, заляглі ў лясной канаве. Цягнік усё бліжэй і бліжэй. Вось ужо відаць паравоз, мільгаюць чорныя цені таварных вагонаў, характэрна пастукваюць на стыках цяжка гружаныя платформы. Прыніклі падрыўнікі да самай зямлі, вось-вось страсяне паветра аглушальны выбух, здрыганецца зямля, папаўзуць пад адкос патрушчаныя вагоны, платформы.

Але цягнік, як ішоў, так і пайшоў сваёй дарогай. Нібы ў насмешку далятаў да хлопцаў замаўкаючы перастук калёс, падміргваў чырвоны агеньчык на хваставым вагоне. Ён робіцца меншым і меншым і знікае зусім на недалёкім павароце.

Хлопцы ўздыхнулі.

— У-у, чорт...

Нехта вылаяўся, камандзір аж сплюнуў. Гэткая-ж няўдача... накінуўся на тых, хто хадзіў на палатно.

— Вам хіба толькі па моркву ў агароды лазіць, а не тыцкацца ў такія справы. Падрыўнікі-кі-і...

Хоць і не дазваляецца лазіць назад, займацца размініраваннем, але не сцярпелі, абясшкодзілі міну, узялі з сабой.

Днём пераканаліся, што тое-сёе з запальнай гаспадаркі падмокла, папсавалася ў часе дарогі, таму і не ўдаўся ўзрыў. Некаторыя з партызан даведаліся аб няўдачы, празрыста намякалі падрыўнікам аб таямнічых выбухах, якіх нават камар не пачуў. Адным словам, падпускалі хлопцам міны. Хлопцы слухалі, адмоўчваліся і дзейна рыхтаваліся да ночы.

Як толькі наступіў вячэрні змрок, падрыўнікі былі ўжо ля чыгункі. Так захапіліся новай аперацыяй, што для лепшай удачы крыху перастараліся, залажылі ледзь не патроеную порцыю толу. Чакалі цягніка з такой нецярплівасцю, што нават не пайшлі ад чыгункі далей чымся за сто метраў, і калі нямецкі воінскі эшалон напароўся ўрэшце на міну і паляцеў пад адкос, хлопцы, як кажа камандзір Максім, перажылі не зусім «прыемнае ўражанне». Прасцей кажучы, хлопцы ледзь не паглухлі ад аглушальнага выбуху. Праўда, гэта «непрыемнае ўражанне» змянілася праз якую хвіліну зусім прыемным. Цэлая груда бітых вагонаў грамаздзілася вышэй насыпу. Адтуль несліся крыкі і енкі падбітых фрыцаў. З некалькіх уцалелых вагонаў пачалася шалёная кулямётная страляніна. Уцалелыя фрыцы, пера-

палоханыя да самых пячонак, білі па лесе. Непадалёчку, у вёсцы абазваўся нямецкі паліцэйскі атрад. Ён страляў наўздагад, мяркуючы, што каля скінутага пад адкос цягніка дзейнічаюць не іначай вялікія партызанскія сілы. Фрыцы з вагонаў прынялі паліцэйскіх за партызан і пачалася ўзаемная тузаніна, якая не змаўкала да самай раніцы.

— Ну, мы ім перашкаджаць не будзем, няхай таўкуцца!—вырашыў камандзір і павёў да лагера сваю дзевятку. Хлопцы былі на сёмым небе ад радасці, ад удачы. А ля чыгункі ўсё не змаўкала страляніна.

— Відаць, пакуль разбяруцца, то нам добра дапамогуць—фрыцаў на свеце паменшае...

Хлопцаў сустрэлі як герояў. А вечарам другога дня сяляне, якіх немцы зганялі на расчыстку чыгункі ад вагоннага ламачча, данеслі партызанам, што немцы павезлі з месца крушэння 370 трупаў салдат і афіцэраў. Пра раненых і казаць нечага. Іх таксама было багата.

За тры дні хлопцы пусцілі пад адкос яшчэ тры эшалоны. Цягнікі перасталі хадзіць па начах, ішлі толькі днём. Павялічыўся нарад патрулёў. Калі хлопцы паспрабавалі выйсці з лесу на палатно днём — іх абстралялі. Доўга яшчэ прачэсвалі лес кулямётамі са сваіх пастоў немцы. Падрыўнікі перамянілі тактыку, прышлося падацца на поле. Жыта стаяла ўжо высокае, густое. Падпаўзалі па межах, прабіраліся да чыгункі па глыбокай лагчыне, парослай дробным кустоўем. Пад адкос паляцела яшчэ тры эшалоны. У падрыўнікоў з'явіліся ўжо надзейныя памочнікі і першым з іх быў сівенькі дзядок. Нейк аднаго разу, калі прабіраліся яны ад чыгункі па сцяжынцы ў жыце і дайшлі да палявой дарогі, яны

напаткалі старога. Той ехаў, відаць, з поля. На рыпучых калёсах, якія ледзь ліпелі, ляжала драўляная барана. Нехлямяжы конік старанна напінаў вераўчаныя гужы, паволі ішоў па дарозе, раз-по-разу ўхітраючыся скубануць абвіслай губой зялёную жыціну ці якое травяное каліва. Параўняўшыся з хлопцамі, стары прыпыніў свайго стаенніка, і, павітаўшыся з імі, папрасіў закурыць. Хітра ўсміхаючыся ў сівыя вусы, ён расказваў, як ачмурэў зусім мясцовы камендант ад новых клопатаў; не праходзіць і дня, як ляцяць пад адхон эшалоны. Збіўся з ног камендант, шукаючы вінаватых.

— І хто-б мог быць? Вось малайцы, дай ім божа здароўя, то-ж добра соляць немцу...

І ўжо зусім таямніча, без хітрыкаў:

— Бачыў вашу працу... учора на расчыстку ганялі, і я там быў... Бачыў, як і вы часам прабіраецеся, але-ж ці добра, такі цяжар на плечах цягаць? Ці мой конь не дапне часам вашага багажу? Толькі загадайце і адразу прыстаўлю ў любое месца...

Ад партызан падрыўнікі даведаліся аб старым. Быў ён бацькам двух чырвонаармейцаў. Немцы нашчэнт абрабавалі яго гаспадарку, адабралі кароў, авечак, свіней.

І колькі раз потым, выязджаючы на поле, вёз стары пад драўлянай сваёй бараной усякія падрыўніцкія прыпасы, і пакідаў іх у загадзя дамоўленых месцах. Нават, калі дровы павёз па нараду ў камендатуру, ухітрыўся падвесці амаль што да самай камендатуры добрую порцыю тола. Камендатура змяшчалася ў мястэчковым доме, непадалечку ад чыгункі, якая праходзіла тут па высокім насыпе. Быў базарны дзень. Камендант праяўляў кіпучую дзейнасць. Пасля трапна пра-

ведзенай аблавы на базары ён дапытваў чалавек з дваццаць сялян, якія паказаліся яму падазронымі, бо ў некаторых не зусім былі аформлены прапускі на базар. У кожным чалавеку камендanту здаваўся падрыўнік, і ён старанна вёў допыт, час-ад-часу кідаючыся да тэлефона і рапартуючы ў горад, што ўсё спакойна, ужо дні з чатыры ніякіх здарэнняў на чыгунцы няма, што след злачынцаў ён вось-вось намацае і дабярэцца да іх.

Але допыт і старанны вобыск затрыманых ніякіх жаданых вынікаў не даваў. Адабраныя дзесяткі яек і некалькі набірак з суніцамі ніякага падабенства з мінамі ці з гранатамі не мелі, і збянтэжаны камендант разгублена барабаніў пальцамі па стале, безуважна пазіраў у акно. Па насыпе праходзіў цягнік.

І раптам аж падскочыў камендант, ледзь не ўпаў ля стала. З усіх шыбак пырхнулі асколкі шкла, аж сарвала фіранкі з акон, затрашчала шалёвачная перагародка, ды нешта цяжкое прагудзела ў паветры і гучна бразнулася ля дому. Збялелы камендант, а за ім і салдаты, кінуўся бегчы з хаты. Першае, што заўважыў камендант, гэта вагонны буфер, які ляжаў ля самага парога. Камендант з адчаем зірнуў на чыгунку і ледзь не самлеў ад страху. Пад адкосам у воблаках дыму і пары грамаздзіліся патрушчаныя вагоны, цыстэрны. Сям-там займалася полымя. Ачмурэлы камендант і салдаты кінуліся да рэштак цягніка. Арыштаваныя, не меўшыя асаблівых падстаў турбаваць далей заклапочаную персону каменданта, палічылі за лепшае далікатна разыйсціся, падацца далей ад усёй гэтай музыкі.

А эшалоны ўсё ляцелі і ляцелі пад адкос. Ужо не ставала толу. Падрыўнікі заняліся зага-

тоўкамі. Знаходзілі нямецкія авіябомбы, нямецкія міны—разбіралі іх, даставалі адтуль тол. Знаходзіць гэтыя «цацкі» дапамагалі вясковыя хлапчукі, якія ведалі кожную мясцінку, дзе ўпала і не ўзарвалася бомба, яны хавалі цэлыя скрыні снарадаў. Падрыўнікі рабілі міны, зарады свае «уласнае вытворчасці». Вясковыя кабеты шылі спецыяльныя мяшэчкі для зарадаў. Як не круціўся староста, але прымушаны быў даваць транспарт для падвозу ўсёй гэтай «авія-сыравіны». Хлопцы ўжо так «абжылі» старасту, што той, як толькі ўчуе чарговы выбух, дык адразу рыхтуе полудзень і ўзмоцнены пачастунак з такога ўрачыстага поваду для неўгамоннай дзевяткі.

Так жылі і працавалі дзевяць маладых падрыўнікоў. Старэйшаму з іх—вясёламу жыццярадаснаму камандзіру атрада Максіму — больш за 20 год. Усім астатнім — кожнаму па восемнаццаць год. Усе яны, за выключэннем камандзіра, былі да вайны вучнямі фабзавуча. Вайна спыніла і сарвала іх мірную вучобу. Пракляты вораг паланіў іх радзіму і абрабаваў родныя вёскі, родныя хаты, адарваў ад родных і знаёмых. Шчаслівы і радасны ўваход у вялікае чалавечае жыццё вораг абарваў, парушыў, разбіў усе планы людзей. Вораг думаў стаптаць іх светлую маладосць, шыбеніцамі і крывёй напалохаць іх чыстыя душы, сумленыя сэрцы.

Дарэмны былі ўсе спробы азвярэлага ворага. Моладзь стала ў рады народных мсціўцаў і помсціць горача, помсціць люта, помсціць бязлітасна.

Дзевяць юных патрыётаў—мы не называлі ні іх імёнаў, ні прозвішчаў—за два месяцы баявой сваёй працы пусцілі пад адкос семнаццаць варо-

жых эшалонаў з тэхнікай, з жывой сілай, з боеприпасамі. Разбіта восемнаццаць паравозаў. Раструшчана на мэтлухі каля трох соцень вагонаў. Пры крушэннях загінула да чатырох тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

Усе ўдзельнікі дзевяткі жывы і здаровы, займаюцца і цяпер баявой сваёй справай.

За бясстрашныя, гераічныя ўчынкі яны ўзнагароджаны ордэнамі Совецкага Саюза: камандзір групы таварыш Максім—ордэнам Леніна, шэсць таварышаў—ордэнамі Чырвонага Сцягу і два—ордэнамі Чырвонай Звязды.



**Міхась ЛЫНЬКОЎ**

# ДВОЕ

Калі ўзыйсці на Гарбаху — парослы дробным хвойнікам узгорак у лесе — то адсюль добра відаць уся чыгунка, аж да станцыі і кілометры на тры да самае павароткі, якая знікае ў глыбокай лагчыне. Ля самай станцыі невялічкі масток праз дробную рачулку. За мастком чыгунка разыходзіцца на дзве каляіны: адна бяжыць крыху лявей, другая направа, на ўсход. Непадалёчку ад мастка—пераезд. Тут-жа блок-пост. За мастком уваходныя семафоры. Чыгунка ад станцыі ідзе пад гору, і калі адыходзіць адтуль цягнік, ён зараз-жа набірае шпаркі ход, і як маланка праносіцца, праз пераезд, праз масток і хутка знікае ў дальняй лагчыне.

Колькі раз выходзіў на Гарбаху камандзір партызанскага атрада і цэлымі гадзінамі сачыў за чыгункай. І чым больш праносілася па ёй эшалонаў, чым больш праходзіла па ёй цяжка-гружаных цягнікоў — з танкамі, гарматамі, накрытымі брэзентам нямецкімі машынамі, — тым пахмурней рабіўся твар камандзіра. Партызаны ведалі, чаму хмурыўся камандзір. Некалькі разоў спрабавалі яны падацца на палатно чыгункі, каб узарваць яго, і не мелі поспеху. На ўсім перагоне

стаяла моцная варта з нямецкіх патрулёў і паліцэйскіх пастоў. На чыгунцы адбываўся вялікі рух цягнікоў і яе моцна ахоўвалі. На станцыі быў моцны гарнізон, былі броняўвыя дрэзіны, некалькі браніраваных платформ. Час-ад-часу яны рабілі аб'езд перагону, змянялі варту, рабілі праверку палатна чыгункі. На пастах уздоўж чыгункі былі пабудаваны бліндажы, агароджаныя калючым дротам, з бетаніраванымі кулямётнымі гнёздамі. Сям-там пускалі ў ход пражэктары, асвятлялі палатно ракетамі, пускалі падвоеныя патрулі. Падступіцца да чыгункі было цяжкавата.

І толькі тут, пад самай станцыяй, пад бокам у гарнізона, на самым, здавалася-б, небяспечным участку, варта была не такой ужо моцнай. Як прасачыў камандзір, на блок-пасту стаяў па начах толькі адзін вартавы, а днём яго змянялі звычайныя паліцэйскія, у штацкай адзежы, з паліцэйскімі павязкамі на руках.

Камандзір паклікаў двух партызан. Гэта былі комсамольцы: Сяргей і Міхась. Міхась быў кавалём у калгасе, Сяргей працаваў да вайны на чыгунцы, быў манцёрам па блакіроўцы. Сяргей ведаў, як свае пяць пальцаў, кожную стрэлку, кожны ліхтар на ўчастку. І калі камандзір паказваў ім на блок-пост і падрабязна тлумачыў пра найлепшыя подступы да яго, ён не мог захаваць шырокай усмешкі.

— Чаго ты смяешся? — нездаволена спытаў камандзір.

— Ды я не смяюся... На гэтым блок-пасту мой бацька працаваў стрэлачнікам, і я ведаю там кожны кастыль, кожную гайку...

— Ну, тым лепш... дык вось, даю вам тэрміну тыдзень. А работка павінна быць чыстай...

Хлопцы абяцалі выканаць заданне.

Штоночы, у цёмную пару Сяргей і Міхась выходзілі на працу. Яны паступова замініравалі некалькі мясцін: ля самага семафора, там, дзе праходзіла паміж шпал скрынка блакіроўкі. Паднялі дошку, залажылі міну, паставілі дошку на месца, прысыпалі пяском. Усё было як і раней, ніякага следу не засталося ад іх працы. Другую міну залажылі бліжэй да мастка, пад самаю стрэлкай, а трэцюю ўхітрыліся залажыць пад самым мастком. Міны злучылі ледзь прыкметным провадам, другім провадам служыла рэйка. Аднойначы Сяргею ўдалося ўскарабкацца на самы семафор. Тут ужо і Міхась не зразумеў спачатку, для чаго патрэбна было Сяргею ўзбірацца аж пад самае вока семафора. І толькі днём Сяргей растлумачыў Міхасю ўсю справу. Раней ліхтары семафора асвятляліся электрычнымі лямпамі. Цяпер засталіся толькі канцы правадоў. Яны ідуць ад семафора на тэлеграфны слуп, а з тэлеграфных слупоў цягнуцца ў будку блок-паста, дзе на сцяне прымацаваны выключацель. Адсюль і запальвалі калісьці семафорныя агні. Цяпер носяць туды газоўкі, устаўляюць у спушчаныя ліхтары, потым падымаюць іх угору. Справа, наогул, марудная.

— Але, як бачыш, справа для нас не ў ліхтарах. Нас цікавяць рэшткі асвятляльных правадоў. Узрываць-жа міны трэба? Трэба. Будзем-жа ўзрываць электрычнасцю.

Прайшло яшчэ з пару дзён. Усё было падрыхтавана. Але хлопцы наведаліся ў суседнюю вёску. Адтуль некаторыя хадзілі працаваць на станцыю, пілавалі там шпалы. Ад рабочых хлопцы дазналіся, што нямецкая карная каманда змянілася, паліцэйскія-ж засталіся тыя самыя.

— Раз немцы новыя, то раніцою мы закончым сваю справу...—ціха сказаў Сяргей Міхасю, прабіраючыся з вёскі ў лес.

— А чым яны лепшыя новыя? Якая між імі розніца?

А розніца вялікая! Новыя немцы не ведаюць у твар кожнага паліцэйскага. А гэта нам і на руку... І Сяргей увёў у некаторыя свае тайныя планы свайго таварыша...

---

Яшчэ не ўзышло сонца, як хлопцы сядзелі ў шырокай бетоннай трубе, пракладзенай для вадастоку пад пераездам. Адсюль яны чулі, як пакашліваў нямецкі вартавы, пастукваў абцасамі ботаў па парозе будкі блок-паста. Роўна а чацвертай гадзіне пачуліся прыглушаныя крокі з боку ад станцыі. Ішоў паліцыянт на змену салдат. Паліцыянт павітаўся з салдатамі. Чуваць, як шарханула запалка, відаць, закурваў на развітанні. Бразнула вінтоўка. Салдат пайшоў да станцыі. Па голасе хлопцы пазналі паліцыянта Купрэйчыка. Гэта праз яго згарэла суседняя вёска, яго рук не мінулі некалькі чалавек павешаных немцамі на бальшаку ля станцыі. Былы злодзей, п'яніца, ён трапіў у рукі немцам па нейкай зладзейскай справе і, ратуючы ўласную скуру, выдаў некалькі чалавек — партызан з навакольных вёсак. Немцы ўзялі яго да сябе на службу—і ён служыць цяпер ім.

Хлопцы назіралі за блок-пастом. Цярусіў дробны дождж. Купрэйчык сядзеў на парозе будкі, нешта мурлыкаў пад нос. Побач, ля сцяны стаяла вінтоўка. Пайшоў спорны дождж, Купрэйчык захінуўся каўняром кажушка, пазяхнуў, замоўк. Перачакалі яшчэ хвілін з пяць, асцярожна вылезлі з трубы. Ад будкі даносіўся лёгкі

ўсхрап, вiдаць, задрамаў палiцыянт. Секунда, другая,—i хлопцы цягнулi нерухомае цела палiцыянта ўнiз да трубы, зацягнулi на самую сярэдзiну, закiдалi ламаччам, каб не заўважыў нiхто да пары, да часу. Знялi павязку з рукава. Вынялi сваю. Павязалi сабе на рукавы. Аглядзелi сваю адзежу — усё ў парадку, нiякага знаку, нi плямiнкi, усё зроблена чыста. Мiхась узяў вiнтоўку, сеў на парожак будкi. Сяргей маланкай кiнуўся ўнiз, уздоўж насыпу. Праверыў свае правады, запалы, хуценька прыбег назад. Вось i выключацель на сцяне. Праверылi злучэнне. Маленькая лямпачка загарэлася роўным святлом. Прынесеная батарэя працавала як след. Павярнулi выключацель.

— Цяпер — не чапай! Толькi па маёй камандзе...

Сяргей яшчэ раз прабег нiзам уздоўж насыпа, уключыў мiну, хутка вярнуўся назад. Колькi тае працы, а абодвы аж спацелi.

Хутка на парожку будкi абыякава сядзеў Сяргей i нiхто не адрознiў-бы яго ад звычайнага палiцыянта. На драўляных нарах у будцы ляжаў, нiбы адпачываў, другi «палiцыянт». Сяргей сядзеў i пакурваў папяросу, стараючыся не выдаць свайго хвалявання. Але сэрца бiлася часта-часта i пальцы да болю сцiскалi вiнтоўку. Прыхiнаючыся бокам да сцяны, адчуваў у сваёй кiшэнi пару гранат. Гэта супакойвала. Ён зiрнуў яшчэ раз у будку, прагаварыў у паўголаса: — Глядзi-ж толькi па маёй камандзе! — i сядзеў, прагна прыслухоўваючыся да кожнага гуку, да кожнага шолаху.

Раптам напяўся ўвесь, як струны. Па гулкiх рэйках даняслося ледзь чутнае тахканне: та-та-та... та-та-та... дзесцi з другога боку да станцыi

падыходзіў цягнік. Вось і далёкі гудок. Цягнік усё бліжэй. Ужо відаць дымок з боку ад вадакачкі. Данёсся працяглы і спаваты сігнал стрэлачніка на ўваходных стрэлках. Вось паказаўся і паравоз. За ім вагоны. Ахутаны парай цягнік спыніўся на станцыі. Хвіліна, другая... Як доўга цягнуцца гэтыя хвіліны.

— Глядзі-ж, толькі па маёй камандзе!—яшчэ раз кідае Сяргей у расчыненыя дзверы будкі.

Паравоз дае гудок. Пара вырываецца густымі клубамі з трубы. Даносіцца лязг буфяроў. Цягнік ідзе са станцыі. Бліжэй і бліжэй паравоз. Вось ужо відаць нямецкі машыніст. Заспаны, ён хмура пазірае з паравоза, выцірае пакуллем рукі. Цягнік з грукатам імчыць ля будкі, праносяцца адзін за другім вагоны.

— Вось параўнаецца паравоз з семафорам, тады... — але думка абрываецца. Цягнік мільгае перад вачамі насцеж расчыненымі дзвярмі. У вагонах пуста, ідзе адзін паражняк. Ужо мінуў паравоз, прагрукацелі па мастку апошнія вагоны. І яны ўжо за семафорам.

Сяргей выцер рукавом спацелы лоб.

— Ты што-ж гэта? Каманда дзе?—накінуўся ўсхваляваны Міхась.

— Ды бачыш-жа: адзін паражняк пайшоў... ці варта псаваць на яго ўсю нашу працу...

Цярпліва чакалі яшчэ. На гэты раз ішоў цягнік на станцыю. Падумаеш—цягнік! Паравоз ды пяць вагонаў... прапусцілі. Гадзіны дзве прайшло ў дарэмным чаканні. Ужо Сяргей шкадаваў, што ўпусцілі першыя цягнікі. Як-ніяк, нарабілі-б ламачча, заграмаздзілі-б абедзве чыгункі — ні ўзад-бы, ні ўперад. А тут як на тое ліха прываломся нямецкі патруль.

— Глядзі цяпер, трымай вуха востра!—шапнуў Сяргей Міхасю, які зноў ладзіўся на нары.

Нямецкі салдат, які ведаў некалькі рускіх слоў, прапанаваў Сяргею ісці паабедаць: «Ідзі, рус, есць... я каравулю...» Не на жарты ўстрывожаны Сяргей на мігі і парай другой слоў растлумачыў немцу, што ён яшчэ пабудзе на пасту, што ён толькі што паабедаў.

— Гут, паліцыянт, гут!—задаволена прамармытаў салдат і падаўся на станцыю. А там стаяў ужо новы цягнік, рыхтаваўся да адыходу.

— Трымайся, брат Міхась!—радасна крыкнуў Сяргей, падміргнуўшы таварышу. —Відаць, канчыцца зараз наша паліцэйская служба.

— Два паравозы ледзь скранулі з месца цяжка гружаны доўгі цягнік. Набіраючы разгон, ён хутка набліжаўся да блок-паста. Вось праімчалі паравозы, замільгалі вагоны. У хвасце з дзесятак платформ, танкі, гарматы. На тармазных пляцоўках салдаты—вартавыя. Сяргей паволі пачаў паднімаць руку. З яго рухаў не спускаў вачэй Міхась. Вось пярэдні паравоз ля самага семафора, і аж крыкнуў Сяргей, рэзка апусціўшы руку:

— Давай, Міхась!

Яны толькі паспелі заўважыць, як цыбаты семафор раптам сігануў угору, нібы нікчэмная запалка, а з ім разам падняліся цэлыя хмары дыму, пары, рознага бруду. З шалёным візгатам пранесліся над галавой ні то ашкепкі дошчак, ні то кавалкі жалеза. Ды няспынныя выбухі, адзін другога мацней, сатрасалі зямлю, паветра. Ушчэнт напалоханыя самі, яны кінуліся ўніз, забраліся ў трубу і перачакалі колькі хвілін, пакуль не перастала падаць долу нейкае ламачча, абломкі, цэлыя лісты грымучага жалеза. З трубы відаць было, як узнялася на станцыі мітусня.

Нехта выстраліў з вінтоўкі, нехта крычаў не сваім голасам. Сёй-той кінуўся ад станцыі. Не было ніякага сумнення, што на станцыі ўзнялася паніка.

Хлопцы вынырнулі з трубы. Падаліся ў канаву. А там хутчэй, хутчэй да бліжэйшага пералеску. Цяжкія выбухі ўсё яшчэ раздаваліся на станцыі і клубы чорнага дыму высока ўзляталі над чыгункай. Хлопцы апынуліся на Гарбасе. Ім насустрач не ішоў, а бег камандзір.

— Ну, як? Жывы? Здаровы? А хлопчыкі вы мае! Вось-жа ўзрадавалі, вось-жа ўсцешылі! Ну, хадзіце-ж вы чэрці, хутчэй...—і ён абняў іх, расцалаваў і, нібы не верачы вачам сваім, абмацаў іх рукі, ногі.

— Ну, значыцца, цэлы! Малайцы, хлопчыкі, вось-жа нарабілі... Не абяруцца немцы ад клопату...

Хлопцы зірнулі на чыгунку. Не было ні маста, ні стрэлак, ні семафора. Усё палатно, адхоны былі завалены грудамі жалезнага лому. Гэтыя груды дыміліся. Сям-там раздаваліся яшчэ невялікія выбухі. Але яны рабіліся ўсё радзей і радзей. Цэлая заслона дыму і пылу цяжкай хмарай навісла над месцам крушэння.

— Ну, ідзіце, хлопцы, адпачывайце... Вось-жа радасць атраду!

Як потым высветлілася, цягнік, які ўзарвалі пад самым носам у немцаў два комсамольцыпадрыўнікі, быў нагружаны авіябомбамі. Дарога на доўгі час была выведзена са строю.



Ілья ГУРСКІ

# ГЛЫБОКІ РЭЙД

## Маскоўскі комсамольскі партызанскі атрад імя Гастэла

Совецкі народ грудзьмі ўстаў на абарону сваёй Радзімы-маці. Беларусы, разам з рускімі і ўкраінцамі, грузінамі і казахамі, разграмілі немцаў пад Масквою, абараняюць Ленінград, разбілі гітлераўскія полчышчы пад Сталінградам.

Чырвоная Армія нанесла зруйнавальныя ўдары нямецка-фашысцкім войскам на Каўказе, вядзе наступальныя баі на Варонежскім і Цэнтральным франтах, прарвала блакаду Ленінграда.

Гітлераўская іржавая ваенная машына напярэдадні катастрофы. Чырвоная Армія, совецкія партызаны б'юць немцаў у хвост і грыву. Але гэта пакуль кветкі, а ягадкі яшчэ наперадзе. Недалёк той дзень, калі гітлераўскія людаеды без аглядкі пакоцяцца назад.

«Вораг ужо спазнаў на сваёй шкуры здольнасць Чырвонай Арміі да супраціўлення. Ён яшчэ спазнае сілу сакрушальных удараў Чырвонай Арміі» (**Сталін**).

Рускія разам з беларусамі вядуць барацьбу не на жыццё, а насмерць супроць нямецкіх акупантаў. Усе народы Совецкага Саюза дапамагаюць беларускаму народу вызваліць з палону Беларусь, усю нашу зямлю, якая часова трапіла ў крывавыя лапы фашыстаў.

Так, комсамольцы Масквы і Маскоўскай вобласці арганізавалі партызанскі атрад імя Гастэла. Маладыя патрыёты добраахвотна пайшлі за лінію фронта, каб дапамагчы беларускаму народу ў справе вызвалення ад нямецкіх захопнікаў.

Паспяховаму рэйду ў Беларусь садзейнічала добра пастаўленая разведка (камандзір Нікалай С.), дзякуючы чаму група гастэлаўцаў прыйшла да месца прызначэння без страт. Недарма кажуць, што разведка—вочы і вушы камандзіра.

— Мы прайшлі па тыле ворага больш за 1.200 кілометраў,—расказвае адзін з удзельнікаў глыбокага рэйду, Нікалай К. — Не пазнаеш Беларусі. Гарады ператвораны ў руіны, на пляцах стаяць шыбеніцы, вецер гойдае целы закатаваных немцамі адважных і мужных сыноў і дачок народа. Усюды — спапялёныя вёскі, абгарэлыя коміны. Немцы ператварылі Беларусь у пустыню. Сэрца сціскаецца ад болю, кроў стыне ў жылах, калі бачыш параненыя грудзі роднай зямлі.

Смерць у абдымку з прускім фельдфебелем ходзіць па палях і нівах Беларусі.

У Барысаве немцы расстралялі больш за 12.000 жыхароў. Каля 4.000 чалавек—у большасці жанчыны і дзеці—закапаны жывымі.

У Кастрычніцкім раёне гітлераўскія галаварэзы жывымі спалілі 990 чалавек.

У Петрыкаўскім раёне загінула ад рукі нямецкіх катаў больш за 1.000 жыхароў.



Мал. Е. Зайцава

У адным з населеных пунктаў немцы закапалі жывымі больш за 300 чалавек; людзі па 2—3 сутак не ўміралі, тады фашысты пусцілі цяжкія танкі, якія зраўнялі магілу з зямлёй.

І так, дзе ні ідзеш, усюды слёзы і кроў. У Беларусі цяпер не ўбачыш на вуснах у людзей усмешкі, не пачуеш песні. Няма тае хаты, каб не было гора. Немцы хапаюць хлопцаў і дзяўчат і адсылаюць іх у Германію, на катаргу.

Вось што піша беларуская дзяўчына Ліза Бурак:

«Дарагія бацька, маці і сястрычкі! Пішу вам гэты ліст з далёкай Германіі. Магчыма, што гэта апошні ў маім жыцці выпадак з вамі пагаварыць. І, каб яго выкарыстаць, я зараз раскажу ўсё папарадку.

Хто ведае, можа гэты ліст будзе апошнім і мы больш ніколі не пабачымся. Дык ведайце горкую праўду пра мой лёс. Вы не можаце сабе ўявіць, як тут цяжка і страшна жыць. Нават ліста свабодна нельга напісаць. Кожная паперка, што ідзе ў Расію, абавязкова правяраецца немцамі. Адна дзяўчына з Мінскай вобласці ў лісце на радзіму напісала, што вось ужо больш за месяц яна не бачыць кавалачка хлеба і харчуецца толькі адкідамі. Гэта вельмі не спадабалася нашаму «гаспадару», і ён загадаў правучыць яе. Каты яе так збілі, што гаротніца ледзь жывой засталася. Чаго-ж мне чакаць тут? Ці-ж дзеля таго я жыла, каб стаць рабой у немцаў? Лепш памерці, чым пераносіць усё гэта.

Як вам вядома, я па позве пайшла ў ваенную камендатуру на перарэгістрацыю. Але мяне падманулі. Ніякай перарэгістрацыі там не было. Гэта было проста зроблена для таго, каб ашукаць

людзей, зацягнуць у свае сеці і потым высылаць іх у сваю імперыю ў рабства. Я была ў адной сукенцы і стала прасіць, каб мяне адпусцілі дадому па адзенне. Нямецкі афіцэр паабяцаў адпусціць на наступны дзень, і я, дурная, на гэтым супакоілася.

Спалі мы ў нейкай старой лазні. Ноччу нас разбудзілі і загадалі выйсці. Я ўбачыла шмат узброеных людзей і не зусім уяўляла сабе, што з намі будуць рабіць. Нас пагрузілі ў вагоны і павезлі. Колькі было крыку і слёз... Жывіліся мы гарачай вадой без цукру, раніцою і вечарам, і агіднай полііўкай у абед. Так у нашым калгасе раней свіней не карміді.

Калі мы прыехалі ў нямецкі горад, нас завялі на нейкую пляцоўку і паставілі напаказ. Немцы падыходзілі да кожнай дзяўчыны і аглядалі яе з ног да галавы. Фізічна моцных, поўных і высокіх, бралі на расхват, а тых, хто за дарогу схуднеў і пажаўцеў ад голаду, немцы аплёўвалі. Я трапіла да нейкага багатага немца. Даводзіцца выконваць усё, што загадваюць. Пра адпачынак і думаць няма чаго. Адным словам, я прапала. Пра мяне ўжо не клапаціцеся, бо ўсё дарэмна. Глядзіце там сябе. Мамачка, не пускай нікуды сястрычак. Няхай уцякаюць ад немцаў, бо з імі будзе тое-ж самае, што і са мной».

Беларуская дзяўчына з мястэчка Дрэтунь, Віцебскай вобласці, якая трапіла на катаржную працу ў Германію, прыслала сваёй маці такі ліст: «Родная мамачка, пасылаю табе першы і, быць можа, апошні ліст. Я ведаю, што ты плачаш... маё жыццё павінна скончыцца ў 19 год. Працую ў нямецкага фермера, чышчу хлеў, нашу і грэю ваду для кароў і свіней. Тут-жа і жыву, бо нем-

цы рускіх лічаць за жывёлу і не пускаюць у дом. Харчуюся адкідамі, са мной яшчэ ні разу ніхто не загаварыў, а паказваюць жэстамі. Наглядаюць за кожным маім крокам. Мамачка, больш ты пра мяне не пачуеш. Такая ўжо мая доля. Гэты ліст дай пачытаць сяброўкам. Бывай, мама».

А вось ліст Кацярыны з Гарадоцкага раёна, Віцебскай вобласці. Яна піша сваёй сястры:

«Дарагая Таня! Адказваю вельмі сур'ёзна і з крыўдай горкай на долю сваю. Дарагая Таня, не чакай, хутчэй забудзь пра мяне назаўсёды, таму, што мы з табою больш не сустрэнемся і не пабачымся. Рашаюся загінуць на чужой старане».

Лісты беларускіх дзяўчат-паланянак пісаны крывёю сэрца. Гэта крык дзявочых душ. У простых, няхітрых словах захаваны вялікі боль, сум па блізкіх, па роднай краіне.

Немцы ўварваліся ў Беларусь, каб пакарыць народ, ператварыць яго ў раба, але гітлераўцам гэтага не ўдасца зрабіць. Беларусь заняволена, але не пакорана. Беларускія бары, сведкі чалавечага гора, шумлівыя рэчкі, якія з сваімі водамі вынеслі шмат слёз і крыві, клічуць народ падняцца на апошнюю бітву, у якой будзе знішчаны паранены шалёны звер.

Масквічы-гастэлаўцы праходзілі па беларускіх дарогах, абапал якіх стаялі параненыя бярозы з пажоўклымі лісцямі, абочыны дарог былі ў варонках ад бомб і снарадаў. Камсамольцы бачылі параненых старых і дзяцей. Гастэлаўцы ішлі па партызанскіх сцежках, па пояс у вадзе, па балотах і дрымучых лясах, праходзілі беларускія рэчкі. Аднойчы ў часе пераправы над іх га-

ловамі кружыў нямецкі самалёт, але маладыя партызаны, не звяртаючы на яго ўвагі, рабілі сваю справу. Лётчык, відаць, прыняўшы партызан за сваіх, падняўся ўверх і знік.

— Смелага куля баіцца і штык не бярэ,—падбадзёрваючы, гаварыў камісар атрада таварыш П. — Хутчэй дабрацца да месца, а там, крыху адпачыўшы, будзем фрыцаў трушчыць. Падсыплем жару. Будуць круціцца, як уюны на скавародзе.

Маладыя патрыёты ішлі з баямі, куляй і гранатай прабіваючы сабе шлях. На станцыі Л. партызан сустрэлі немцы кулямётным, ружэйным і мінамётным агнём. Гастэлаўцы з боем прайшлі чыгунку. Фашысты больш за 2 кілометры праводзілі партызан, абсыпаючы градам волава і чыгуна. Была цёмная ноч. Гастэлаўцы, збіўшыся з дарогі, заблудзіліся, трапілі ў дрыгву. Іх вывеў на дарогу 12-гадовы хлопчык.

Ветліва сустракалі беларусы маскоўскіх камсамольцаў партызан, дзяліліся з імі апошнім, дапамагалі ім, распытвалі, што робіцца ў Маскве.

А то неяк немцы, дачуўшыся, што ідуць партызаны, пабаяліся прыняць бой, але зрабілі пакасць. Пры пераправе цераз рэчку О. аказалася, што паром быў падпілаваны фашыстамі. Калі партызаны ад'ехалі на сярэдзіну рэчкі, паром з грузам боепрыпасаў пайшоў на дно. Камісар атрада таварыш П. з групай партызан выратаваў боепрыпасы. Усе людзі былі перапраўлены.

Гастэлаўцы пабылі ў некалькіх партызанскіх атрадах, слава аб якіх чутна па ўсёй Беларусі. Яны пабачылі загартаваных у баях старых партызан, убачылі праслаўленых на ўвесь Савецкі Саюз кіраўнікоў атрадаў партызан. Моладзь дзівілася партызанскай кемлівасці і хітрасці.

— Аднойчы,—расказваў стары партызан Мікіта,—мы зрабілі засаду ля дарогі, па якой павінны былі ехаць нямецкія машыны з войскам. Кал фашысцкія аўтамабілі наблізіліся, мы выпусцілі некалькі парасят і курэй. Немцы, пакінуўшы машыны, кінуліся арганізоўваць сабе закуску, эрзац-шнапсу ў іх хапае — яны возяць яго ў парашках. А мы тым часам сыпанулі з кулямётаў і аўтаматаў. Забілі каля сотні немцаў.

— А мы яшчэ спрытней зрабілі, — ажывіўся партызан Пятро. —У нашай вёсцы размясціўся штаб адной нямецкай часці. Яны загадалі дастаць ім рускай горкай. Мы па поўкварты сабралі з кожнага калгасніка. Перад вайной у нас вялася чарка і скварка. Паставілі закуску. А калі афіцэры напіліся, маці загадала мне пусціць пеўня. Старая не пашкадавала сваёй хаты. Так спалілі мы 11 фрыцаў.

— Дзед Анісім!—крычалі партызаны. —Раскажы, як ты памыў немцаў у лазні.

— Што тут казаць, — важна гаварыў былы калгасны вартавы, дзед Анісім.—Не пашкадаваў дроў. Напаліў па-гаспадарску. Сінія агеньчыкі дапамаглі мне тады ахадаць чатырох гіцаляў. Каб не пачадзелі, хіба-ж бы я з імі справіўся пасля. Рэч вядомая, ўзваліў я іхнія аўтаматы на плечы, ды ходу ў лес. А хіба ты так не зрабіў бы? У нас так заведзена, што кожны б'е немца, як можа. Скажам, мая старая, Домна дык тая варам абварыла з галавы да ног фюлера. Пішчаў, падла, як свіння ў плоце.

Гастэлаўцы неслі ў народныя масы бальшэвіцкую праўду, яны былі агітатарамі і прапагандыстамі, расказвалі, што робіцца ў Совецкім Саюзе, аб падзеях на фронце, аб рабоце тыла. Маладыя

партызаны на свае вочы бачылі, як дзейнічалі іх старэйшыя браты па барацьбе.

Гастэлаўцы ішлі на захад. Партызанскі кавалерыйскі атрад, якім камандуе таварыш Т., дачуўся, што ідзе нейкая часць, але не ведаў хто. Ён выслаў насустрач разведку, якая, як потым высветлілася, 20 кіламетраў праводзіла гастэлаўцаў. Партызаны атрада таварыша Т., высветліўшы, хто яны, прынялі гастэлаўцаў, як родныя браты, накармілі, далі адпачыць, а потым паказалі найкарацейшы шлях да іх месцаследавання.

Слава пра партызан-кавалерыстаў таварыша Т. гучыць па ўсёй Беларусі. Яны добра ўзброены. Маюць свае аўтаматы, кулямёты і нават гарматы. Камандзір атрада таварыш Т. надзвычай дзейны чалавек. Ён сам не адседжваецца і не любіць, калі суседнія атрады бяздзейнічаюць. Таварыш Т. ўсё робіць для таго, каб актывізаваць партызанскую барацьбу.

— Калі я не заб'ю немца, — гаворыць таварыш Т., — то не магу спакойна абедаць. Маё сэрца прагне помсты.

Пра партызанскі атрад таварыша Т. ведаюць і старыя і малыя. Звычайна, калі ён выязджае на аперацыю, дае з усіх гармат залп-салют. Ён гэта робіць для таго, каб паказаць суседнім атрадам, што ў яго заўсёды ёсць боепрыпасы. Часамі, некаторыя скардзяцца, што ў іх не хапае патронаў. У атрадзе таварыша Т. заўсёды ёсць чым, ёсць з чаго і ёсць па чым страляць.

Гастэлаўцы на свае вочы бачылі біркі на грудзях у людзей, жанчын і дзяцей, старых. Там, дзе былі шырокія калгасныя палі, там цяпер вузкія палоскі. Там, дзе раней працавалі трактары, там цяпер селянін рыдлёўкай капае зямлю. У сэрцах маладых барацьбітоў закіпала ярасць,

нянавісць, жаданне адпомсціць ворагу за прынесеныя людзям пакуты, слёзы і кроў, за смерць сотень, тысяч невінаватых мірных совецкіх людзей.

17 кастрычніка 1942 года гастэлаўцы напалі на станцыі К. на эшалон, дзе ехаў карны атрад СС, забілі 147 салдат, аднаго генерала, разбілі эшалон. У гэтым баю загінуў смерцю храбрых адважны партызан Саша Ільічоў.

Пахавалі Сашу Ільічова з партызанскім ушанаваннем. Маладыя патрыёты на яго магіле пакляліся адпомсціць немцам за смерць свайго друга. І яны помсцяць. Гастэлаўцы б'юцца, як львы.

Атрад імя Гастэла ўдзельнічаў у падрыве чугуначных мастоў праз рэкі П. і Б., у знішчэнні нямецкіх гарнізонаў. Тут асабліва праявілі сябе дзяўчаты—партызанкі Галіна К. і Ніна М. Атрадам разгромлены паліцэйскія гарнізоны ў вёсках Л. і С. Атрадам знішчана 7 нямецкіх эшалонаў.

Атрад заваяваў павагу і любоў у мясцовага насельніцтва, якое бачыць у партызанах сваіх абаронцаў. Ад моладзі няма адбою, усе просяцца, каб іх прынялі ў атрад.

Камандуе атрадам імя Гастэла Казімір П. За час сваёе дзейнасці атрад набыў баявыя якасці, узмужнелі маладыя партызаны, загартаваліся ў баях.

За апошні час асабліва праявіў сябе малады партызан-падрыўнік Аляксандр Т., які падарваў некалькі эшалонаў.

Атрад мае ўсе мажлівасці разрасціся ў маладзёжную партызанскую брыгаду. Партызанскі атрад імя Гастэла аказвае дзейную дапамогу Чырвонай Арміі. Маскоўскі-комсамольскі атрад шукае, знаходзіць і знішчае ворага. Маладыя

патрыёты добра памятаюць загад: «Партызанам і партызанкам узмацніць партызанскую вайну ў тыле нямецкіх захопнікаў, разбураць сродкі сувязі і транспарта ворага, знішчаць штабы і тэхніку ворага, не шкадаваць патронаў супроць прыгнятальнікаў нашай Радзімы!» **(Сталін).**



Пімен ПАНЧАНКА

## КРАІНА МАЯ

Краіна мая, радасць мая,
Песня мая маладая!
Па нівах тваіх, па тваіх гаях,
Сынняе сэрца рыдае.
Ты часта прыходзіш ка мне,
як сон,
Хмараю прыплываеш,
Птушкай садзішся на ціхі клён,
Звонкім дажджом ападаеш.
Тады ўспамінаецца ўсё да
драбніц,
Што звязана з родным краем,—
Як жыта шуміць, як агонь
зарніц
На дне азёр дагарае,
Як летам спякотным за днямі дні
Ішлі па іржышчы калючым.
Мы ранілі ногі аб камяні,
І нам не было балюча.
І не было нічога ярчэй
За сонца на родным небе,
І не было нічога смачней
Матчынага хлеба.
Вада з прыдарожнага ручая
Была саладзей за мёд нам...

Краіна мая, маці мая,
Лёс твой цяжкі і гаротны.
Топча, катуе тваю зямлю
Вылюдак ашалелы.
Я кроў да апошняе кроплі пралью,
Каб толькі табе палягчэла.
Ні славы, ні скарбаў я не хачу,
Мне-б толькі прыйсці
непрыкметна,
Зямлю сваю пад нагамі адчуць,
Надыхацца родным паветрам.

★

Янка КУПАЛА

## БЕЛАРУСКІМ ПАРТЫЗАНАМ

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны!

На руінах, папялішчах,
На крывавых іх слядах
Хай груган іх косці ліча,
На бяседу соваў кліча,
Баль спраўляюць на касцях.

Няхай Гітлеру—вампіру
Клююць сэрца, смокчуць кроў,
Сыты быў людскім ён жырам,
П'яны быў крывавым вірам,
Хай-жа гіне звер звяроў!

Не давайце гадам сілы
Над сабою распасцерць,
Рыйце загадзя магілы,
Вырывайце з жывых жылы,
Кроў за кроў, а смерць за смерць!

Няхай наша перамога
Не кідае вас нідзе,
Не пужае хай трывога,—
Ваша чыстая дарога,
Да свабоды давядзе.

Вашы бітвы ўвесь свет бача,
Бача Сталін родны наш,
Як фашыстаў зброд сабачы,
Людаедаў зброд смярдзячы
Нішчыць ваша варта-страж.

Так ад нечысцяў ачысцім
Нашы нівы і лясы,
Фашыстоўскіх псоў панішчым,—
І схінуцца, як калісьці
Для нас нашы каласы.

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны!

★

Аркадзь КУЛЯШОЎ

## ЛІСТ З ПАЛОНУ

«Дарагі!.. Не хаваю тугі.
Невясёлы мой лёс, невясёлы...
Пакідаю я родныя сёлы,
Па рэйках вязуць мяне колы
У Нямеччыну, нібы ў Турэччыну...
Не адна я,—з дзяўчатамі,
ўсіх нас вязуць у няволю.
Пакідаюць дзяўчаты бацькоўскія хаты
І плачуць у волю.

Я пішу і не плачу, я стала скупою на слёзы,
Толькі кінуць хачу свае косы
Цягніку пад калёсы,
Але марныя гэта намеры,—
Не пускаюць за дзверы.

Дарагі!.. Мы мінаем Дняпра берагі
І дняпроўскія хвалі.
Як нам шкода ракі, на якую вянкі
Мы заўчора кідалі.

І плылі васількі, і танулі вянкі,
І дзяўчаты сядзелі,
А мой сіні вянок плыў удаль

Паміж хваль,
Пакуль вочы глядзелі.

Мне здалося: стаіш ты ў новай
Кашулі вайсковай,
У зялёнай кашулі,
І кулі цябе не кранулі.

Можа, нават, кранулі, праклятыя, ды не забілі,—
Быццам зноў мы з табою ідзём,
як калісьці хадзілі,
Быццам сон усё тое, што скончаны нашы гулянкі,
Што дарогі ў жытное
Стапталі нямецкія танкі,

Быццам замуж я выйшла, ты муж мой,
а я твая жонка.
Узяліся за рукі, смяёмся вясёла і звонка.
Але, што я пішу, дарагую мне трачу паперу,
Я, ты-ж знаеш, гаданням не веру,
не веру, не веру.

Любы мой!.. Развіталася сонца з зямлёй,
Пацямнелі дубровы...
З-за дубоў узыходзіць мой страшны,
мой месяц мядовы.
Васількі за акном пацямнелі,—плачуць сінія вочы
І няхай сабе плачуць, не бачаць
мой сорам дзявочы.

Давядзецца мне спаць, ды не так,
як яны мне хацелі,
У чужынца на правай руцэ,
ды ў магільнай пасцелі
Я пішу, я прашу, — ты прыдзі,
ты адпомсці, мой мілы,

Не прашу за сябе,—за зямлю,
што нас лёгка насіла.

Я ўжо буду не тая, а след тваіх ботаў убачу,
Пацалую яго і, як баба старая, заплачу...
Родны мой!.. час і мне раставацца з табой...
Шлях суровы, суровы... ці ён дойдзе, ці знойдзе
Цябе, ліст звычайны мой, ліст папяровы?
Як не знойдзе, чытай па дарозе
ад Оршы, ад Брэста
Ліст другі, ліст даўгі,
Што на шпалах пісала нявеста.

А калі не яна, не сама, то падругі пісалі, няйначай,
Паліваючы кожную шпалу і рэйку
слязою гарачай.
Ліст, ад сэрца ўсяго, паланёная склала дзяўчына,
Ты чытай і адказ на яго
На штыку данясі да Берліна

Ты чытай, ты змывай
Слёзы з рэек чужою крывёю,
Я пішу, я прашу:
Ганьбу змый,—не хачу быць такою!
Я — рабыня, рабыня, я чорная, чорная, чорная.
Любы мой, не з табой,
А з праклятай бядой заручоная...

Вось і горад вялікі і шэры,
Чую гоман з чужога перону.
Адчыняюцца дзверы,
Загадваюць выйсці з вагону,
На кірмаш нас прывезлі,—
І ліст свой канчаць я павінна.
Тут купляюць дзявочыя косы,
Дзявочыя слёзы...
Хрысціна».

★



С. МЕЛЬНІКАЎ

# РЫМА ШАРШНЁВА



Невысокая дзяўчына паднялася з лаўкі. Каганец асвятляў яе зусім яшчэ дзіцячы, крыху стомлены твар.

— Ну, я пайшла.

Жанчыны, якіх было многа ў хаце, не сталі яе затрымліваць: час позні, а дарога доўгая і небяспечная. Але кожная жадала, каб дзяўчына пабыла яшчэ, і каб бясконцым было яе апавяданне аб тым, як б'юць немчуру нашы чырвоныя воіны, як ідзе жыццё па той бок фронта, як жыве Масква — наша надзея. Дзяўчына гаварыла заўсёды хвалююча і шчыра, і словы яе даходзілі да сэрца, запальвалі, надавалі сіл, дапамагалі пераносіць цяжкасці, прыглушалі слёзы.

Яна апранула ватнюю куртку, нахаду папраліла цёплую шапку. Жанчыны праводзілі яе да варот.

— Да спаткання, родныя...

— Шчаслівай дарогі, Рыма!.. Прыходзь часцей.

Цёмная ноч стаяла над вёскай, над палямі, над лесам, у які цяпер Рыма трымала шлях. Мароз скаваў зямлю.

Рыма ішла хутка. Маленькая, поўненькая, яна быццам кацілася па дарозе. Звычайна хлопцы жартавалі: «Наша Рыма, як агурчык».

Многа разоў, як і зараз, стомленая і ўпэўненая ў сабе, ішла яна шырокімі шляхамі, няходжанымі сцежкамі з сяла ў сяло, збірала жанчын і гутарыла з імі, умацоўваючы ў іх веру ў прыход Чырвонай Арміі і жаданне бязлітасна помсціць ворагу. Аднойчы яна накіравалася ў мястэчка і там стварыла падпольную комсамольскую арганізацыю. Маладая комсамолка Рыма павяла юнакоў на баявую аперацыю. Ах, як пылалі ў той дзень будынкі бургомістра і паліцэйскай управы!..

Калі Рыма ўвайшла ў зямлянку, партызаны заканчвалі апошнія прыгатаванні да заўтрашняга дня. Заставалася некалькі гадзін да світання, да пачатку аперацыі.

Рыма прынесла з сабой свежань снежаньскай ночы. У зямлянцы загучэў яе звонкі голас. Нехта ціха заспяваў, і Рыма змоўкла. Яна не ўмела пець, але вельмі любіла слухаць і, калі заспявалі песні, знаёмыя і блізкія яе дзявочаму сэрцу, яна слухала вельмі ўважліва, затаіўшы дыханне...

Як часта бывае ранняй зімой, на світанні сёмага снежня прасторы пакрыліся густым туманам і, калі ён пачаў рассейвацца, стала цяплей. Партызаны выходзілі з зямлянак. Яны былі ба-

дзёрыя і вясёлыя, нягледзячы на тое, што хутка іх чакалі цяжкія, суровыя хвіліны.

У вёсцы Л. размяшчаўся вялікі нямецкі гарнізон. Фашысты чынілі дзікія расправы над мірным, безабаронным насельніцтвам. Навакольныя вёскі былі ператвораны імі ў попел, а людзі знішчаны.

Подступы да вёскі ахоўваліся дзотамі. Гэта быў моцны вузел супраціўлення. Трэба было разграміць нямецкі гарнізон.

Камандзір атрада аддаваў апошнія загады і правяраў гатоўнасць да паходу. Невялікія групы ўходзілі на вызначаныя пазіцыі.

Адной з груп кіраваў высокі чорнавалосы прыгажун Павел, храбры воін. З гэтай групай пайшла Рыма. Яна была ўзброена аўтаматам, баявыя якасці якога неаднойчы паспыталі фрыцы на сваёй скуры.

Па сігналу пачалася атака. Загаварылі кулямёты, вінтоўкі. Мясцовасць напоўнілася грукатам, гулам, грознай музыкай бою.

Партызаны ўжо блакіравалі шэсць дзотаў, размешчаных направа і налева ад цэнтральнага дзота, які быў найбольш магутным і прыкрываў падыход да вёскі. З яго бесперапынна стралялі нямецкія бандыты.

Уся ўвага групы Паўла сканцэнтравалася на гэтым дзоце. Адваёўваючы метр за метрам, падпаўзалі ўсё бліжэй да яго партызаны. Вось ужо зусім недалёка...

Рыма ідзе за сваім камандзірам. Раптам да яе далятае слабы стогн. Няўжо гэта праўда?..

Рыма бачыць, як корчыцца ад болю камандзір, як кулі свішчуць навокал яго і вось-вось смерць напаткае храбрага партызана.

І тады, не думаючы ні аб чым, апрача выратавання жыцця камандзіра, яна хутка прабіраецца наперад і целам сваім закрывае амбразуру дзота. Быццам нажы, пракалваюць яе кулі. Па целу разыходзіцца востры боль.

Дзот замаўкае. Партызаны ідуць у атаку, урываюцца ў вёску і бязлітасна б'юць немцаў. Бой працягваецца, але гітлераўцы ўжо здаюць адну вуліцу за другой і сілы іх слабеюць.

Рыма ляжыць ля дзота. Да яе падпаўзае партызан.

— Жывая!—радасна ўскрыкнуў ён. — Проста цуда!

Ён кладзе Рыму на плашч-палатку і ідзе да лесу.

Потым яна ляжыць у зямлянцы. Яна даведваецца ад таварышоў, што бой скончыўся паспяхова і варожы гарнізон разгромлен.

— А як камандзір?

— Папраўляецца. Пра цябе ўсё пытае.

— Перадайце, што я хутка буду здаровай,— ціха гаворыць яна.

Але сілы пакідаюць дзяўчыну. Усё радзей усмешка на яе збялелым твары. Яна часта губляе прытомнасць. А калі прыходзіць у сябе бачыць светлую школу-дзесяцігодку ў Мінску, дзе вучылася да вайны, зялёны гарадок Добруш, у якім прайшлі дзіцячыя годы, раку Іпуць, дзе яна любіла купацца і было так прывольна. І яшчэ яна думае аб тым, што хутка, калі ачуняе, зноў возьмецца за зброю.

На пяты дзень яна памерла.

На яе магіле адбыўся жалобны мітынг. Партызаны гаварылі аб вялікай сіле любві да со-

вецкай радзімы, якая нарадзіла ў сэрцы Рымы пякучую нянавісць да чужынцаў.

Над труною схіліўся чырвоны сцяг. Здавалася, на ім была свежая светлая кроў Рымы Шаршнёвай. Чырвоны сцяг шумеў на ветры і ў гэтым шуме нібы чулася:

— Адпомсці!.. Адпомсці!..

Партызаны прынялі гэтыя словы, як свяшчэнную клятву, і з таго часу з яшчэ большай ярасцю знішчаюць нямецкіх акупантаў.

А ў вёсках жанчыны з любоўю ўспамінаюць аб невысокай, простай дзяўчыне, якая перадала ім сваю бадзёрасць і сваю нянавісць да ворага. І часта ідуць яны да ўзгорка ля лесу, туды, дзе пахавана іх семнаццацігадовая сяброўка, дачка Беларусі.



Цімох КРЫСЬКО

# МІНСК КЛІЧА!

Горад маладосці—так называлі мы свой Мінск. І сапраўды, сталіца была ўвасабленнем маладосці нашага народа, роўнага і пачэснага ў вялікай брацкай сям'і. З твару нашага роднага горада ніколі не сыходзіла жывая, маладая ўсмешка. Нават у пахмуры дзень нам здавалася, што над Мінскам ззяе сонца.

Як сімвал нашай дзяржаўнасці ўзвышаўся над Мінскам велічны Дом ураду. На шырокай плошчы, каля яго, на мрамарнай трыбуне, у жывым натхнёным парыве стаяў вялікі Ленін. Тут адбываліся ўсе самыя радасныя падзеі ў жыцці нашага народа. Памятаеце, як у дні свят плошча расцвітала яркімі сцягамі і кветкамі, як наша моладзь спявала тут свае любімыя песні, танцавала свае вясёлыя танцы? І здавалася, жывымі вачыма глядзіць наш Ленін і радуецца нашаму шчасцю.

Усе, хто нарадзіўся і вырас у гэтым горадзе, у яго прыгожых жывапісных ваколіцах, усе, хто быў у сталіцы, добра помніць Мінск. І асабліва цяпер, у дні цяжкага выпрабавання для нашага народа, кожны дом, кожная вуліца Мінска ўстаюць у нашай памяці, як лепшыя гады яго жыцця, як самае дарагое і лепшае ў жыцці—яго маладосць.

І дзе-б мы не былі, наша памяць, наша ўяўленне не могуць змірыцца з тым, што такога Мінска, якім мы яго ведалі, Мінска, які мы выбудавалі сваімі рукамі ў годы сталінскіх пяцігодак, няма, што над ім, спаленым, скалечаным, разбураным і залітым крывёю, пануе пакутная ноч.

У нашай памяці Мінск жыве маладым, сонечным, вясёлым горадам.

Вось мы ідзём уніз па Совецкай вуліцы. Звіняць трамваі. Яркае ліпеньскае сонца гуляе па шкле светлых акон, на вітрынах магазінаў. Пяройдзем бульвар, пройдзем паўз будынак Драматычнага тэатра і спусцімся ў парк культуры імя Горкага. Гэта — любімае месца адпачынку і весялосці мінчан. Шумяць высокія сосны. Усюды зелень і кветкі. Пад поўдзень, калі сонца прасушыць жоўты жвір на дарожках, парк напоўняць нашы дзеці-піонеры ў чырвоных гальштуках, нашы шчаслівыя школьнікі. Як яны рады цяплу і сонцу, як вясёла яны бегаюць па алеях парка, слухаюць шум лёгкага ласкавага ветра ў верхавінах дрэў, знаходзяць свае знаёмыя кветкі...

Усім нам памятна лета ў Мінску, наша вясёлае лета ў яго ваколіцах, у парках, на стадыёнах і вуліцах сталіцы. Толькі няма яго сёння ў Мінску. Цяжкае слова «фашыст» усюды, на кожным кроку, ходзіць за чалавекам, вісіць жалезнымі кратамі над душою моладзі, над душою нашых дзяцей.

Глянем у вочы жорсткай праўдзе! Таго Мінска, які жыве як самае запаветнае і дарагое ў нашай памяці —няма. Горад у руінах, у попеле. Аб гэтым крывавыя бандыты Гітлера пішуць з асаблівай асалодай. Фашысцкія газеты «Дэйчэ Цэйтунг ін Остланд» і «Бруселер Цэйтунг» паведамляюць аб тым, што «у Мінску разбурана 85 про-

цантаў будынкаў». Гітлераўскія нягоднікі пішуць аб гэтым, як аб сваёй заслузе перад гісторыяй.

Фашысцкая погань спаліла, разбурыла ўсё, што было нам блізкім і дарагім. Замест універсітэцкага гарадка, дзверы якога былі шырока раскрыты для нашай моладзі ў навуку, у жыццё, — сёння стаяць знявечаныя камяніцы. Дашчэнту спалены самыя прыгожыя вуліцы — Ленінская і Карла Маркса. Горад вымер. Над ім пануе нямецкі штык. Тысячы маладых мінчан — хлопцаў і дзяўчат — акупанты вывезлі на катаржныя работы ў Германію, загналі ў нямецкія канцлагеры.

Вуліцы Калгасная, Остроўскага, Калгасны завулак па загаду нямецкіх катаў адгароджаны высокай муравнай сцяной. Гэта — адно з самых жудасных месц горада, гэта — засценак смерці. Тут, за гэтай сцяной, замучаны тысячы сямей. Іх зганялі з усяго горада і доўга катавалі. І мужчын, і жанчын, і малых дзяцей раздзявалі, забіралі ўсё адзенне, і забівалі. Трупы закатаваных вывозілі за горад і там кідалі ў вялікую, загадзя выкапаную, канаву.

Мінск сёння — гэта турэмны засценак, кожная вуліца, кожны завулак яго паліты крывёю. Па загаду крывяжэрнага душыцеля беларускага народа — Гітлера ў Мінскім раёне знішчана ўжо каля 100.000 чалавек.

На плошчах Мінска, на самых відных месцах узвышаюцца нязменныя вартавыя гітлераўскага «новага парадку» — шыбеніцы. Гэта — для застрашэння совецкіх людзей. На вуліцах і завулках горада шныраць, выследжваюць, вынюхваюць перапранутыя гестапаўцы і паліцэйскія. Схапіць, павесіць — вось клопаты іх кожнага дня.

Апошнюю хлебную крыху вырываюць у мінчан гітлераўцы, каб утхланіць сваю ненасытную, пра-

жэрлівую зграю. Сотнямі мруць мінчане штодзень ад голаду, ад масавых эпідэмій, якія лютуюць у кварталах знявечанага горада. Асірацелыя дзеці, як цені, сланяюцца па дварах, корпаюцца ў сметніках, у адкідах, каб знайсці што з'есці.

Так выглядае Мінск, які яшчэ нядаўна радаваў наша вока сваім багаццем, сваім прыгоствам!

Цэнтр культуры беларускага народа, скарбніца яго лепшых здабыткаў, зняслаўлены, апаганены брудным ботам гітлераўскіх забойцаў і грабежнікаў, марадзёраў і зладзеяў. Яны раскралі ўсе лепшыя творы Карціннай галярэі, знішчылі, расцягнулі каштоўнейшыя рукапісы старажытнай літаратуры, якія захоўваліся ў Акадэміі Навук і Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна. Спалілі дамы нашых любімых паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, а іх кнігамі, якія мы яшчэ змалку вывучалі напамяць, іх кнігамі фашысты вымошчваюць каляіны на вуліцах.

З першых дзён свайго прыходу гітлераўцы прынеслі сваю «культуру».

Адразу-ж яны адчынілі дзесяткі дамоў распусты, куды на пацеху сваёй бруднай салдатні сагналі сотні беларускіх дзяўчат. Цяпер у Мінску няма ні аднаго кінотэатра. Усім вядомы прыгожы тэатр «Чырвоная Зорка» яны ператварылі ў прыстанішча нямецкіх галаварэзаў. Пpасторныя, светлыя файе і зал тэатра забруджаны, заплёваны вашывымі фрыцамі.

Нядаўна гітлераўцы ўрачыста абвясцілі, што яны адчыняюць кінотэатр пад назвай «Беларускае кіно». — «Мы, — пісалі фашысты, — будзем паказваць у ім фільмы два разы ў тыдзень — у суботу і нядзелю. Гэтым будзе задаволена патрэба мінчан у мастацтве».

Нахабныя ідыёты! Яны хваляцца сваім балаганам. Мінчан не ашукаеш. Яны добра памятаюць, што ў Мінску пры Савецкай уладзе было 6 тэатраў, цырк, канцэртныя залы і дзесяткі кінотэатраў.

Маладыя нашы землякі! Усюды, дзе вы чуеце наш голас—у лесе, у полі, у партызанскім лагеры, — ведайце, што гэта голас скалечанага зняслаўленага, але непакоранага, непераможнага Мінска, голас бацькаўшчыны.

— Мацней сціснем у руках зброю помсты!

— Кожную кулю ў сэрца фашыста!

— Смерць кожнаму немцу на беларускай зямлі!





М. ШКЛЯР

## НЕ ЗАБУДЗЕМ, НЕ ДАРУЕМ!

Кроў стыне ў жылах, рукі яшчэ мацней сціскаюць зброю, калі ўспомніш, у што ператварылі Беларусь гітлераўскія бандыты. Беларускі народ, беларуская моладзь вядзе рахунак усіх злачынстваў нямецкіх акупантаў. І па гэтым рахунку гітлераўцы заплацяць спаўна, заплацяць сваёй паганай чорнай крывёю.

Вось Мінск — сталіца рэспублікі. Замест горада маладосці—руіны. Фабрыкі і заводы спалены. Культурныя ўстановы разбураны, забруджаны, ператвораны ў дамы распусты. На руінах і папялішчах пастаўлены шыбеніцы.

Немцы разграбілі і спалілі Жлобін, Рагачоў, Чачэрск, Шклоў, Быхаў і буйнейшы прамысловы цэнтр Беларусі — Гомель.

Гітлераўцы разбурылі і спалілі цэлыя кварталы ў Віцебску, Магілеве, Оршы, Полацку, Гродне, Лідзе, Баранавічах, Ваўкавыску і іншых гарадах.

Змецены з твару зямлі сотні вёсак. Гітлераўскія галаварэзы кінулі супроць мірнага насельніцтва танкі, браневікі, самалёты. Яны палілі вёскі, клубы, больніцы, выразалі цэлыя сем'і, кідалі жывых людзей у агонь, закапвалі дзяцей жывымі ў зямлю.



Мал. П. Гаўрыленка

Ў адным толькі Парыцкім раёне, Палескай вобласці, з 295 вёсак — 145 немцы спалілі і разбурылі поўнасцю. У Суражскім раёне, Віцебскай вобласці, фашысты за некалькі дзён спалілі 41 вёску. Там, дзе стаялі хаты — папялішчы. Там, дзе шумелі сады — галавешкі, абгарэўшыя пні. Там, дзе жылі людзі — жудасныя магілы. Жыхары закатаваны, расстраляны. Гітлераўскія бандыты не пашкадавалі ні дзяцей, ні старых. Калі некаторыя школьнікі змаглі ўсё-ж вырвацца з рук катаў, нямецкія галаварэзы наладзілі за імі паляванне, лавілі і кідалі жывымі ў агонь. На папялішчах валяюцца трупы старых, дзяўчат і дзяцей — іх раздавілі танкі. Гэтых жудасных магіл нельга забыць! Гэтага немцам нельга дараваць!

Крывавы мучыцель Беларусі — Гітлер загадаў сваім разбойнікам: «Забівайце ўсё савецкае, забіце кожны па сто рускіх, не спыняйцеся, калі гэта стары, жанчына, дзіця». І нямецкія каты праводзяць гэты загад у жыццё.

24—25 чэрвеня на Маскоўскім і Магілеўскім шасе дзесяткі нямецкіх самалётаў расстрэльвалі натоўпы жанчын і дзяцей, пакідаўшых разбураны, ахоплены полымем Мінск. Тысячы трупаў услалі дарогі.

Пад Рагачовам у Дняпры купалася 40 хлопчыкаў. На брыючым палёце нямецкія лётчыкі расстралялі іх з кулямётаў. Крывёю ні ў чым нявінных дзяцей афарбаваліся воды Дняпра. Гітлераўцы не перасталі страляць да таго часу, пакуль не быў забіты апошні хлопчык.

У горадзе Беластоку немцы за адзін дзень расстралялі 400 жанчын і дзяцей. На ўскраіне горада яны ўбілі ў зямлю пяць завостраных калоў і прывязалі да іх трупы жанчын. Трупы былі

голыя, з распоратымі жыватамі, выразанымі грудзямі, адсечанымі галовамі. Галовы валяліся ў лужынах крыві разам з трупамі скалечаных і забітых дзяцей.

Пасля заняцця Ломжы нямецкія афіцэры выгналі на вуліцы сем'і, якія не паспелі адыйсці разам з Чырвонай Арміяй, і безабаронных жанчын і дзяцей секлі на кавалкі, адразалі рукі і ногі, выколвалі вочы...

У вяках будзе стаяць вобраз чатырохгадовага беларускага хлопчыка, якога на Лагойскім тракце, пад Мінскам расстраляў з самалёта гітлеравец. Хлопчык убачыў, як яго маці павалілася на зямлю, расстраляная фашысцкім сцярвятнікам.

— Мама! — закрычаў ён. Але маці была ўжо мёртвай. У гэты час немец пацэліў і ў хлопчыка. Ад болю і страху ён прабег яшчэ некалькі крокаў і паваліўся на гарачую родную зямлю, абліўшы яе сваёю крывёю. Неўзабаве хлопчык памёр.

У вёсцы Боркі, Кіраўскага раёна, Магілеўскай вобласці, немцы загналі ўсіх жыхароў у хаты. Потым некалькі бандытаў на чале з афіцэрамі пачалі хадзіць з хаты ў хату і забіваць усіх: старых, жанчын і дзяцей. З 2.000 жыхароў было расстраляна 1.950. Потым вёску немцы падпалілі. Яна згарэла датла.

Нямецкі палкоўнік Зігерман у сваім «навучанні» патрабуе ад салдат: «Асабліва бязлітасна патрэбна знішчаць моладзь, бо яна лютая ў сваёй нянавісці да немцаў». І фашысцкія паганцы асабліва жорстка распраўляюцца з нашай моладдзю.

У адной вёсцы фашысты схапілі 8 дзяўчат-комсамолак. Нельга перадаць тых пакут, якія прышлося перанесці дзяўчатам. На целе комса-

молак немцы выразалі крыжы. Раздзетыя трупы дзяўчат каты выставілі на паказ. Прыставілі вартавога. Цэлы месяц ляжалі комсамолкі, выклікаючы ў совецкіх людзей страшэнную нянавісць да гітлераўскіх нягоднікаў.

У вёсцы Лоўка, недалёка ад Бабруйска, фашысты закапалі жывымі ў зямлю 6 комсамольцаў.

У Глускім раёне немцы расстралялі комсамольца Сярогіна і разам з ім бацьку — рабочага. Другога комсамольца яны павесілі на дроце.

Няма канца спісу жудасных распраў над беларускай моладдзю.

У вёсцы Халмы, Клічаўскага раёна, немцы згвалцілі шэсць 16—17 гадовых дзяўчат. Потым гітлераўцы выразалі ім грудзі, выкалалі вочы і расстралялі. Дзяўчыну Аксёнаву немцы прывязалі да двух нахіленых дрэў і разарвалі напалам.

Нядаўна немцы расстралялі ў Мінску на вакзале 100 дзяўчынак і хлопчыкаў ва ўзросце ад 5 да 12 год. За што? За тое, што дзеці прасілі хлеба ў праезджых.

У Шклове немцы закапалі жывымі ў зямлю жанчын і дзяцей. Тры дні варушылася зямля над пахаванымі. У Петрыкаве немец вырваў дзіця з рук настаўніцы Кустановіч і на вачах маці кінуў жывым у агонь. Каля Ельска фашысты 7 дзён пратрымалі галоднымі на баржы 500 жанчын і дзяцей, а потым разам з баржай утапілі ў Прыпяці.

Беларусь сёння — гэта чорныя ад пажараў руіны. Усюды смерць і спусташэнне, папялішчы, шыбеніцы. Не сціхаюць енкі і плач сірат. Усё гэта прынёс на беларускую зямлю гітлераўскі бандыт. Нямецкія каты павесілі, закатавалі і расстралялі ў Мінску і Мінскім раёне — каля 100.000 мірных совецкіх людзей, у Магілеве

—больш 14.000, у Пінску—больш 10.000, у Віцебску—6.000, у Бабруйску—5.000, у Клічаве—2.000. А колькі закатавана, забіта і павешана ў другіх гарадах і раёнах? Льецца кроў нявінных людзей. Гэта кроў кліча да помсты, кліча на смяротны бой з гітлераўскімі нягоднікамі.

Гітлераўскі сатрап Кубе ў сваёй гутарцы аб вярбоўцы рабочай сілы ў нямецкую няволю сказаў: «Беларутэнія (так называюць немцы Беларусь) можа ўжо зараз пасладь у Германію тысячы сваіх юнакоў і дзяўчат ва ўзросце ад 18 да 25 год у якасці сельскагаспадарчых рабочых. Германіі цікава атрымаць у расавых адносінах добрага, прывыкшага да цяжкай працы рабочага».

Сілай, штыкамі і ашуканствам гоняць немцы моладзь Беларусі на катаргу, на далёкую чужыну, у логава звера—Германію. У лютым—сакавіку месяцы 1942 года толькі з Гомеля вывезена ў Германію 2.000 чалавек моладзі, з Віцебска—2.500 чалавек.

Недалёка ад горада Полацка немцы стварылі перасыльны лагер, дзе знаходзіцца больш 300 дзяўчат і жанчын з беларускіх вёсак. Нядаўна 20 дзяўчат заявілі аб тым, што яны не хочуць быць нямецкімі рабынямі і нікуды з роднай зямлі не паедуць. Гітлераўцы доўга здзекваліся над імі, а потым расстралялі.

У Германіі сыноў і дачок беларускага народа прадаюць на кірмашы, як рабынь. Там, у Нямеччыне, савецкіх людзей заганяюць у шахты, на фабрыкі і прымушаюць працаваць па 18 і больш гадзін у суткі. Вось пісьмо, якое напісана не чарнілам, а крывёю і горкімі слязьмі беларускай дзяўчыны Алесі Саковіч, якая трапіла на катаргу ў тройчы праклятую Нямеччыну:

«Добры дзень, мае родныя, знаёмыя! У першых радках свайго пісьма хачу паведаміць, што я самая няшчасная сярод вас. Мяне немцы загналі далёка на чужыну. Тут горш чым у турме. Кормяць нас дрэнна: на дзень выдаюць па кацялку недаваранай бурды. Я спачатку не магла есці, кожны раз ад агіды мяне ванітавала.

Мамачка! Я вельмі схуднела, стала часта хварэць. Прасіла ў пана адпусціць да доктара, але ён груба мне адказаў: «А хто за цябе, быдла, працаваць будзе? Хіба я купіў цябе за твой прыгожы твар?»

Наогул, тут усе звяры, гатовы жывога ў магілу закапаць. Яны не маюць ніякай літасці да беднага чалавека. Працаваць прыходзіцца бясплатна, ад цямна да цямна, і ніхто цябе не пашкадуе. З раніцы я кармлю гаспадарскую жывёлу, мыю памяшканні, падмятаю двор, а потым рыхтую для панскіх пакояў паліва, цягаю на сабе дровы. Спаць прыходзіцца ў дзіравым і халодным хляве, дзе не толькі чалавек, а нават сабака жыць не будзе.

Адным словам, мне цяжка аб гэтым пісаць. Сэрца абліваецца крывёю, з вачэй коцяцца слёзы. Калі пашчасліціць і мы яшчэ спаткаемся— тады раскажу аб усім падрабязна.

Да пабачэння, мае дарагія бацькі. Не ўспамінайце ліхам сваю дачку. Не па добрай волі я пайшла ў няволю. Мяне загубілі злыя людзі. І за гэта мае браты ім жорстка адпомсцяць.

**Ваша Алеся Саковіч».**

Кожнае слова гэтага пісьма паліць сэрца агнём нянавісці да нямецкіх разбойнікаў. Кожнае слова гэтага пісьма заве да зброі на барацьбу з нямецкімі акупантамі.

Метадамі дзікага гвалту праводзіцца анямечванне акупіраваных раёнаў. У Беларусі, па паведамленню нямецкіх газет, беларускія школы закрыты. «Мэта школьнай палітыкі,—пішуць немцы,—заключаецца ў нямецкай арыентыроўцы беларускай моладзі». Выданы загад, па якім па ўсёй Беларусі беларускі шрыфт замяняецца лацінскім. Паведамляючы аб гэтым, газета «Мінскер цэйтунг» піша, што «пакольні ў Германіі прызнаны лацінскі шрыфт, ён павінен стаць адзіным шрыфтам і для Беларусі».

Моладзі і дзецям фашысты закрылі ўсе шляхі да ведаў. Сталінскія школы ва ўсіх беларускіх гарадах або спалены, або ўзарваны. Сельскія школы, клубы, хаты-чытальні гітлераўцы ператварылі ў канюшні.

Беларускі народ ганарыўся сваёй Дзяржаўнай бібліятэкай імя Леніна ў Мінску. Гітлераўцы спалілі кнігі бібліятэкі, а памяшканне апаганілі.

Разбураны Гомельскі палац Паскевіча-Эрыванскага, рэдкі архітэктурны помнік і музей.

Ва ўсіх гарадах і вёсках знішчаны і спалены ўсе грамадскія і прыватныя бібліятэкі. Спалены творы любімых пісьменнікаў і паэтаў беларускай моладзі: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Міхася Лынькова, знішчаны дзесяткі тэатраў, музыкальныя ўстановы і лепшыя ўзоры народнай творчасці.

Дзевяць дзесятых беларускай моладзі фашысты хочуць знішчыць, адну дзесятую ператварыць у рабоў. Але беларускі народ, беларуская моладзь ніколі не будуць рабамі нямецкіх паноў і фабрыкантаў.

«Браты мае і аднагодкі! Радзіма дала нам розум і веды, работу нашым моцным рукам, адкрыла нам шырокі шлях у жыццё. І мы кляліся,

што будзем абараняць нашу любімую радзіму, наш народ. Настаў час выканаць гэту клятву.

Я многа вёрст прайшоў па роднай зямлі, захопленай ворагам, і бачыў гора майго народа. У Суражы фашысты штыкамі і кулямётамі загналі сотні совецкіх людзей на міннае поле. Тых, хто ўцалеў, каты расстралялі. У Астроўскім сельсовеце, Суражскага раёна, немцы забілі і замучылі больш 300 чалавек. Усю нашу зямлю залілі яны крывёю нашых людзей. Я бачыў сотні забітых і скалечаных людзей. Бачыў, як вецер гойдае трупы на шыбеніцах у маім родным горадзе. Сціснуўшы зубы, я сказаў: пакуль жыў — буду помсціць фашысцкім варварам! І мы помсцім».

Так гаварыў на першым антыфашысцкім мітынгу беларускай моладзі партызан-ордэнаносец Валенцін. Гэта—клятва ўсёй беларускай моладзі.

Помста — гэта закон нашага жыцця, нашай свабоды, нашай чэсці. Кожны з нас павінен сёння жыць адным жаданнем, адным імкненнем: за кроў, за слёзы, за разбой, за мілую сэрцу, родную Совецкую Беларусь, бязлітасна знішчаць паганую немчуру! Біць так, каб фашысты захлынуліся ў сваёй чорнай крыві. Кроў за кроў, смерць за смерць—вось наша клятва!



Цімох КРЫСЬКО

## СУДНЫ ДЗЕНЬ

Што заслужыў — не абмінеш. Прымай!
Прымай, сусветны кат, нянавісцю кляймёны.
Збяру я слёзы, гора і адчай,
Усе праклёны.

Збяру я попел спаленых братоў,
Зняслаўленых сясцёр пакуты,
Збяру іх чыстую святую кроў,
Іх боль і смутак.

Вось спадчына мая і запавет.
Яны перадалі мне ўсё па праву.
І вызначылі ў сведкі свет,
І дзень расправы.

Той судны дзень у твар табе глядзіць
Бязлітаснымі, прагнымі вачыма,
Дык падніміся-ж, помста, і ідзі
Па ўсёй айчыне.

І ўсюды, дзе засцігнеш—папялі
Апошніх вылюдкаў, увесь іх нарад.
Ты гнеў людскі збяры з усёй зямлі,
Ляж цяжкай хмарай.

Пачнуць здыхаць—хай чорным груганом
Пагарда прыляціць і выдзяўбе ім вочы.
За спалены бацькоўскі дом,
За лёс сірочы,

За гора, слёзы, за адчай,
За ўсе праклёны.
Што заслужыў — не абмінеш. Прымай!
Прымай, крывавы кат, нянавісцю кляймёны!

★

## МАСКВА, ЦК ВЛКСМ, ЦК ЛКСМ БЕЛАРУСІ

Мы комсамольцы, комсамолкі чырвоных партызанскіх атрадаў Клічаўскага раёна, Магілеўскай області, сабраўшыся на першую падпольную комсамольскую канферэнцыю, шлём вам сваё сардэчнае гарачае прывітанне.

Знаходзячыся ў глыбокім тыле ворага часова акупіраванай Беларусі, мы хочам расказаць ЦК ЛКСМБ аб нашых баявых справах, аб бязмежнай любві беларускай моладзі да сваёй Радзімы, да свайго Совецкага ўрада.

Паўтары гады, як нямецкія бандыты знішчаюць усё, што дорага нашаму сэрцу, усё, што дала нам совецкая ўлада. Тысячы нашых таварышаў расстраляны, закатаваны, вывезены на страшную катаргу ў Германію.

Куляй і шыбеніцай, бізуном і штыком, голадам і здзекамі фашысцкія нягоднікі стараюцца прымусіць нас, беларускую моладзь, працаваць на нямецкіх князёў і баронаў. Але фашысцкім катам ніколі не пакарыць наш народ, нашу совецкую моладзь. Нашы сэрцы гараць нянавісцю да азвярэлых ворагаў. У лясах, гарадах і сёлах часова акупіраванай Беларусі з кожным днём растуць і шырацца рады партызан і партызанак, якія абараняюць чэсць, свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

У барацьбе з нямецкімі захопнікамі выраслі бясстрашныя, мужныя барацьбіты-комсамольцы.

Сваімі геранчнымі подзвігамі яны натхняюць моладзь на знішчэнне фашысцкіх варвараў. Мы ганарымся слаўнымі справамі 13 комсамольцаў Н-скага партызанскага атрада, якія, пагарджаючы смерцю, уступілі ў бой з 200 нямецкімі варварамі. У гэтым няроўным баю совецкія патрыёты, знішчыўшы больш 80 гітлераўцаў, загінулі смерцю адважных. Геранчна загінуў у барацьбе з нямецкімі захопнікамі комсамолец-кулямётчык Міхаіл Беразоўскі, імем якога называецца Н-скі комсамольска-маладзёжны атрад.

Зусім нядаўна партызаны, якія дзейнічаюць у нашым раёне, адбілі адну з шматлікіх карных экспедыцый немцаў. На гэты раз нямецкае камандаванне накіравала на партызанскія атрады некалькі тысяч салдат і афіцэраў, больш 20 танкаў, авіяцыю, мінамёты. У смелых баях нашы патрыёты адбілі нямецкіх варвараў, прымусілі немцаў пакінуць беларускія лясы.

Наш баявы вопыт, нашы баявыя сілы з кожным днём растуць. Не зламаць волі комсамольцаў ні танкавай бранёй, ні жалезам. Сэрца маладога патрыёта, сэрца комсамольца мацней сталі.

Завяраем Цэнтральны Камітэт Комсамола, што мы моцна трымаем у руках баявую сталінскую зброю і не выпусцім яе з рук да таго часу, пакуль ні аднаго гітлераўца не застанецца на нашай роднай беларускай зямлі.

Няхай жыве наша перамога!

Няхай жыве совецкая моладзь!

Няхай жыве Ленінска-Сталінскі Комсамол!

Няхай жыве наш дарагі, любімы правадыр народаў Іосіф Вісарыёнавіч СТАЛІН!

☆

## ЗМЕСТ

Стар.

П. Глебка — Правадыр . . . . . . . . . . . 5
Прысяга беларускіх партызан . . . . . . . . . 7
Я. Колас — Байцам-комсамольцам . . . . . . 8
М. Зімянін — Моладзь у баях за Беларусь . . 10
К. Крапіва — М. Сільніцкі . . . . . . . . . 16
П. Глебка — Да моладзі . . . . . . . . . . 34
К. Чорны — Жэня Палтаўская . . . . . . . . 36
Я. Колас — Душою і сэрцам я з вамі, героі . . 40
Я. Макарэнка — Дзяўчына ў шынялі . . . . . 42
П. Панчанка — Саша . . . . . . . . . . . . 49
П. Броўка — Паэма пра Смалячкова (Урыўкі) . 52
М. Цвярской — Трынаццаць . . . . . . . . . 66
К. Крапіва — Развітанне сына . . . . . . . . 72
М. Танк — Гастэла . . . . . . . . . . . . 73
М. Танк — Не шкадуйце, хлопцы, пораху! . . . 74
А. Куляшоў — Балада аб чатырох заложніках . 75
М. Лынькоў — Знішчальнікі эшалонаў . . . . . 78
М. Лынькоў — Двое . . . . . . . . . . . . 90
І. Гурскі — Глыбокі рэйд . . . . . . . . . . 98
П. Панчанка — Краіна мая . . . . . . . . . 109
Я. Купала — Беларускім партызанам . . . . . 111
А. Куляшоў — Ліст з палону . . . . . . . . 113
С. Мельнікаў — Рыма Шаршнёва . . . . . . . 116
Ц. Крысько — Мінск кліча . . . . . . . . . 121
М. Шкляр — Не забудзем, не даруем! . . . . . 126
Ц. Крысько — Судны дзень . . . . . . . . . 135
**Прывітанне ад першай падпольнай камсамольскай арганізацыі** . . . . . . . . . . 137

★

**Рэдактар І. Гурскі** Тэхн. рэдактар **А. Савары**
**Вокладка А. Лігачэвай** Карэктар **Ц. Алуф**

Падпісана да друку 19/VIII 1943 г. $4^3/_8$ друк. аркуш.
Тыраж 20000. А2723 Зак. № 847

Друкарня «Известий», Масква

Цана 4 руб.